Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 18 (28634)

26 СТУДЗЕНЯ 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

ДЭКРЭТ № 1: АБ САДЗЕЙНІЧАННІ ЗАНЯТАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Дэкрэт № 1, якім прадугледжаны меры па садзейнічанні занятасці насельніцтва, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Дакумент накіраваны ў першую чаргу на актывізацыю работы органаў улады па максімальным садзейнічанні грамадзянам у працаўладкаванні, стымуляванні працоўнай занятасці і самазанятасці насельніцтва.

З гэтымі мэтамі дэкрэтам на ўрад ускладаюцца задачы па вызначэнні прагнозных паказчыкаў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва і пераліку тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы, па ажыццяўленні маніторынгу, ацэнкі якасці і даступнасці паслуг у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва.

У сваю чаргу мясцовыя органы ўлады будуць забяспечваць індывідуальную работу з грамадзянамі на месцах пры правядзенні работы па іх працаўладкаванні і рэсацыялізацыі асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Акрамя таго, абласныя і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў змогуць дадаткова накіроўваць сродкі мясцовых бюджэтаў на рэалізацыю мерапрыемстваў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва на тэрыторыях з напружанай сітуацыяй на рынку працы.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ВАШЧАНКА, міністр па надзвычайных сітуацыях:

«Прымаючы грамадзян, заўсёды трэба імкнуцца ўнікаць у іх турботы. Гэтая работа патрабуе асаблівай увагі. На прыём прыходзяць з рознымі пытаннямі, у большасці выпадкаў расказваюць пра набалелае. Выслухоўваем, імкнёмся разабрацца ў праблеме, нават калі пытанне не па нашай кампетэнцыі. Усе звароты фіксуюцца і перадаюцца для рэагавання ў тую структуру, якая непасрэдна займаецца гэтай тэмай. Нейкіх важных нявырашаных пытанняў па профілі МНС няма. Выязджаючы ў раёны, я бачу, што на месцах вядзецца вялікая работа. Часта грамадзяне прыходзяць на прыём, каб проста выказаць падзяку».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.01.2018 г.

Долар ЗША	1,9741	▼
Еўра	2,4507	▲
Рас. руб.	0,0352	▲
Укр. грыўня	0,0687	■

ISSN 1990 - 763X

18018

9 771990 763008

Гладка, хоць бокам каціся

У горадзе Беразіно пяты год у зімовы час заліваецца хакейная каробка, каб аматары пакатацца на каньках маглі адпачыць, патрэніравацца, авалодаць тэхнікай фігурнага катання. А ахвотных пабегаць на каньках у горадзе над Бярэзінай нямала. Лядовай пляцоўкай апякуецца гарадскі фізкультурна-аздараўленчы цэнтр «Лазурны», і кожную раніцу на пляцоўцы робяць новую заліўку, каб каток выглядаў роўным і гладкім. Заліўкай вады займаюцца людзі, якія ў свой вольны час не супраць дапамагаць цэнтру, і адзін з іх — кіроўца-дальнабойшчык Сяргей ПАЛАЗКОЎ *(на фота)*, ён жа — аматар хакейнай каманды горада.

— Канструкцыю залівачнага агрэгата мы падглядзелі ў Мар'інай Горцы ў такім жа цэнтры. За гэты час наша тэхніка ніколі не падводзіла. Дзве гадзіны — і каток гатовы! — кажа Сяргей.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Разумныя грошы

БЯРЭШ ЧУЖЫЯ, А АДДАВАЦЬ ДАВОДЗІЦЦА СВАЕ...

Праўда, разумеем мы гэта звычайна ўжо пасля таго, як трапляем у не вельмі адназначнае становішча. І заўважу, што трапіць на такі кручок «аматараў бясплатных падарункаў» можа любы чалавек, незалежна ад узросту, полу, адукацыі і сацыяльнага статусу. Пасля размовы з банкаўскім работнікам кліент упэўнены: так пашанцавала выключна яму. Таму і трэба карыстацца момантам, нават нягледзячы на нейкія там дробязі... Але ў фінансах дробязяў няма.

Усё куплю зараз

Зразумела, што самыя папулярныя сёння спажывецкія крэдыты — на тэрмін да года. Гэта так званыя кароткія крэдыты на не вельмі дарагія пакупкі. Многія камерцыйныя банкі пачалі выдаваць такія крэдыты на тэрмін ад 7 да 12 месяцаў па стаўцы ад 9 % да 16 % пры выкананні спецыяльных патрабаванняў да заяўніка. Тэрмін карыстання можа быць і большы. Але ў гэтым выпадку стаўка па крэдыце павялічваецца. Так, працэнты на крэдыт да двух гадоў роўныя стаўцы рэфінансавання плюс 2 %, да трох гадоў — стаўцы рэфінансавання плюс 3 %, да чатырох гадоў — стаўцы рэфінансавання плюс 4 %. І гэта мінімальныя стаўкі.

Але разгледзім крэдыты на год і даведаемся, што атрымаць іх можна пры пэўных умовах. У першую чаргу трэба мець даведку аб даходах, што сведчыць пра штомесячны «чысты» прыбытак кліента, які складае не менш за 300—400 рублёў. Праўда, калі заяўнік або паручыцель з'яўляюцца кліентамі банка і атрымліваюць заработную плату на яго ж плацежную картку, даведкі аб даходах не патрабуецца.

Кліент банка павінен мець рэгістрацыю на тэрыторыі краіны, узрост ад 18 гадоў і стаж на цяперашнім месцы работы ад трох месяцаў. Заўважу, што максімальную суму крэдыту вам дадуць толькі ў тым выпадку, калі існуе больш сур'ёзны даход, а стаж складае не менш за год ці нават два. Акрамя таго, банкі пачалі цяпер патрабаваць ад кліентаў дакумент воінскага ўліку (для мужчын, якія не дасягнулі ўзросту 27 гадоў). Аднак, мабыць, самы галоўны мінус танных крэдытаў на спажывецкія патрэбы ад невялікіх прыватных банкаў — тое, што стаўка па такіх пазыках можа змяняцца.

СТАР. 4

■ Карані

ЗАПАВЕТЫ СЕЛЯНІНА МАЛЯНКОВА

Як былы бізнесмен з'ехаў на вёску і вядзе натуральную гаспадарку

У вёсцы Стрэльчыкі, што ў Гродзенскім раёне, Аляксандр МАЛЯНКОЎ пасяліўся некалькі гадоў таму. Прычым «асеў», што называецца, капітальна. Мала таго, што паставіў зруб і завёў гаспадарку — каго гэтым здзівіш? — Малянкоў паглыбіўся ў сялянскі побыт больш радыкальна. У яго сям'і спажываюць толькі натуральныя прадукты, а сам гаспадар нават навучыўся пячы хлеб і вырабляць сычужны сыр.

СТАР. 5

У ГІМНАЗІЮ — БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 30 «Аб прыёме ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і навучанні ў іх».

Указам устанаўліваецца, што набор у 5-я класы гімназій будзе ажыццяўляцца без правядзення ўступных выпрабаванняў. Усе навучэнцы, якія завершаць навучанне ў 4-м класе гімназіі, змогуць працягнуць навучанне ў 5-м класе гэтай жа гімназіі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Адмена экзаменаў дазволіць зняць неапраўданую псіхалагічную і эмацыйную нагрузку на навучэнцаў пачатковых класаў, што ў цэлым будзе спрыяць захаванню іх здароўя.

Пры прыёме ў 5-я класы гімназій-каледжаў мастацтваў конкурсны адбор па выніках праверкі творчых здольнасцяў захоўваецца.

Такі падыход прадаставіць магчымасць навучання ў гэтых гімназіях найбольш таленавітым, што маюць прыродныя задаткі, дзецям, якія хочуць звязаць сваё далейшае прафесійнае жыццё з мастацтвам.

Адначасова ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжваецца магчымасць вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні. Рэалізацыя гэтай нормы прадаставіць роўныя ўмовы для атрымання якаснай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ўсіх відаў, а таксама пашырыць магчымасці яе атрымання з улікам індывідуальных здольнасцяў і схільнасцяў школьнікаў.

Мінадукацыі і Мінкультуры ў двухмесячны тэрмін будуць прыняты ўсе прававыя акты, неабходныя для рэалізацыі норм названага Указа.

ДЭКРЭТ № 1: АБ САДЗЕЙНІЧАННІ ЗАНЯТАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У новы дэкрэт не ўвайшлі нормы аб збіранні з працаздольных непрацуючых грамадзян збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў. Пры гэтым асобы, якія раней прызнаваліся плацельшчыкамі гэтага збору, вызваленыя ад яго выплаты.

Дэкрэтам прадугледжаны канцэптуальна іншы падыход, накіраваны на стымуляванне працаздольных непрацуючых грамадзян да легальнай занятасці. Прадугледжана, што з 1 студзеня 2019 года такія асобы будуць аплачваць паслугі, што субсідуюцца дзяржавай, па іх поўным кошце. Канкрэтны пералік такіх паслуг даручана вызначыць ураду.

Ключавая роля ў арганізацыі работы па выкананні нормаў дэкрэта адведзена мясцовым органам улады. Для гэтага прадугледжваецца стварэнне мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пастаянна дзеючых камісій, асноўныя задачы якіх — садзейнічанне грамадзянам у працаўладкаванні.

У склад камісій будуць уключацца дэпутаты ўсіх узроўняў, спецыялісты мясцовых органаў улады, а таксама прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў. Узначальваць камісіі, якія ствараюцца на раённым узроўні, будуць, як правіла, старшыні Саветаў дэпутатаў.

Дэкрэт дае камісіям шырокія паўнамоцтвы, у тым ліку па прыняцці рашэнняў аб вызваленні на пэўны час працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы, ад абавязку аплачваць паслугі па поўным кошце пры наяўнасці ў іх цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Для рэалізацыі дэкрэта ўрад прыме шэраг пастаноў, якімі будуць у тым ліку вызначаны парадак аднясення працаздольных грамадзян да незанятых у эканоміцы, пералік паслуг, што аказваюцца такім грамадзянам па поўным кошце, парадак разліку платы за гэтыя паслугі і іншыя пытанні.

Акрамя таго, прадугледжваецца прыняцце ўрадам мер, накіраваных на актывізацыю прафілактычнай работы з працаздольнымі непрацуючымі грамадзянамі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця; дзейнасці падатковых органаў па выяўленні і падаткаабкладанні ўтоеных прыбыткаў фізічных асоб.

Дэкрэт уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

СПРАВЫ ГРАШОВЫЯ І БАНКАЎСКІЯ

Рацыянальна выкарыстоўваць маёмасць і вызваліць Нацыянальны банк ад неўласцівых функцый. Менавіта да гэтага заклікана спецыялізаваная арганізацыя (яе плануюць стварыць), якая аб'яднае функцыі па аказанні касава-інкасатарскіх паслуг Нацыянальнага банка, Беларусбанка і Белаграпрамбанка. Пра яе, а таксама сітуацыю ў крэдытна-фінансавых арганізацыях і банкаўскай сістэме краіны Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел Калаур.

— Якая сітуацыя на валютным рынку? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Ці пацвярджаюцца тыя тэндэнцыі, або яны крыху лепшыя, чым мы з вамі абмяркоўвалі напярэдадні Новага года? Што мы можам чакаць у будучыні ад курса рубля? Гэта вельмі важна для нашай эканомікі ў цэлым.

На думку Прэзідэнта, стварэнне нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі — інкасатарскай групы — дапаможа пазбавіцца ад неўласцівых Нацыянальнаму банку функцый. Але тут галоўнае пытанне: ці не прывядзе гэта зноў да «раздування» сферы?

— Перш чым падпісваць указ, я думаю, усё ж такі нам трэба абмеркаваць з вамі, ці можам мы без яе (зв. — арганізацыі) абысціся або гэта сапраўды вельмі выгадная справа для банкаўскага сектара ў цэлым, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Павел КАЛАУР расказаў пра сітуацыю на валютным рынку:

— У нас цяпер курс блізкі да раўнаважнага. Дзякуючы той палітыцы, якую праводзілі папярэднія некалькі гадоў, мы выйшлі на курс, які, з аднаго боку, поўнасцю задавальняе нашых экспарцёраў, з іншага — адпавядае задачам падтрымання фінансавай і цэнавай стабільнасці.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ І ВЫБАРЫ

Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Уладзімірам Андрэйчанкам

Які мы цяпер маем склад парламента? Наколькі актыўна дэпутаты супрацоўнічаюць з іншымі краінамі? І ці варта «разводзіць» па часе парламенцкую і прэзідэнцкую выбарчыя кампаніі? Пра гэта і ўвогуле пра дзейнасць беларускіх заканатворцаў ішла гутарка падчас сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра Андрэйчанкі.

Галоўнае пытанне, якое было зададзена спікеру, датычылася заканатворчай дзейнасці парламента. Кіраўнік дзяржавы папрасіў даць характарыстыку дзеючаму парламенту, бо, паводле яго слоў, менавіта ў парламенце правяраюцца кадры, якія ў далейшым могуць стаць дзяржаўнымі служачымі на розных пасадах. «Таму што ўзровень дэпутата — гэта вельмі высокі ўзровень», — заўважыў Прэзідэнт.

Важны аспект работы дэпутацкага корпуса — міжнародная дзейнасць. І справа тут не толькі ў міжпарламенцкіх кантактах. Гэта значны і дыпламатычны, і эканамічны складнік, закліканы даваць імпульс развіццю адносін паміж краінамі, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Абмяркоўваліся падчас сустрэчы і маючыя адбыцца ў недалёкай будучыні выбарчыя кампаніі. Так, прэзідэнцкія выбары ў 2020 годзе павінны прайсці не пазней за 20 жніўня, выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — не пазней за 10 верасня, выбары членаў Савета Рэспублікі — не пазней за 11 верасня.

«Парламенцкія выбары — шмат розных пунктаў гледжання, паколькі яны супадаюць з прэзідэнцкімі выбарамі. Мы, вядома, афішыраваць пакуль не будзем яго, але, тым не менш, у вас пункт гледжання свой ёсць. Як вы бачыце выхад з гэтай сітуацыі?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

«Пры гэтым я хачу сказаць, што мы ні ў якім разе не павінны тут неяк хітраваць, як некаторыя пішуць з пятай калоны ў сродках масавай інфармацыі, асабліва ў інтэрнэце, што Лукашэнка тут пойдзе не нейкія датэрміновыя выбары для таго, каб выйграць час, яшчэ штосьці, — сказаў Прэзідэнт. — Глупства. Я ніколі не гуляўся з гэтымі рэчамі і гуляцца не збіраюся».

«Калі будзе прынята рашэнне аб тым, каб развесці гэтыя выбары ў часе або праводзіць сумесна, мы аб гэтым скажам загадзя, каб органы ўлады і ахвотныя стаць членамі парламента і кандыдатамі ў прэзідэнты падрыхтаваліся да гэтага. Мы тут нікога падманваць не маем намеру», — падкрэсліў беларускі лідар.

Вераніка ПУСТАВІТ.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, пасля сустрэчы паведаміў журналістам:

— Кіраўніком дзяржавы было рэкамендавана прыярытэтную ўвагу ўдзяліць пытанням эканамічнага блоку, такім як развіццё прадпрымальніцтва, пытанням самазанятасці насельніцтва, інвестыцыйнай дзейнасці.

Сур'ёзнай карэкціроўцы будуць падвергнуты кодэксы: аб адукацыі, жыллёвы, падатковы. З гэтай нагоды мы правядзём шэраг парламенцкіх слуханняў. Таксама пашырыцца і геаграфія нашых двухбаковых сувязяў. Мы рыхтуем новую рэзалюцыю, якая будзе накіравана ў Парламенцкую асамблею АБСЕ. Яна будзе прысвечана пытанням кібербяспекі.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў асаблівую ўвагу на ўзмацненне работы дэпутатаў у выбарчых акругах, асабліва цяпер, напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы.

■ Сацыяльны клопат

ДА ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

У сталіцы адбылася першая сустрэча партнёрскай групы ўстойлівага развіцця пры Савеце ўстойлівага развіцця з удзелам прадстаўнікоў дзелавой супольнасці і ўсіх зацікаўленых грамадскіх аб'яднанняў. На парадку дня было абмеркаванне 17 мэт, вызначаных у 2015 годзе дзяржавамі — членамі ААН на перыяд да 2030 года. Сярод іх — дасягненне эканамічнай, экалагічнай і сацыяльнай устойлівасці.

Мэты ўстойлівага развіцця (МУР) — стратэгічна важныя для ўсяго чалавецтва. Яны скіраваныя на паляпшэнне ўзроўню жыцця. Дасягнуць іх магчыма толькі ў выпадку партнёрства і ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў грамадства. Па словах **намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальнага каардынатара па дасягненні МУР Мар'яны ШЧОТКІНАЙ,** менавіта таму сустрэча носіць адкрыты характар і праводзіцца ў форме дыялогу.

«Гэта адкрытае мерапрыемства вельмі важнае, бо на ім прысутнічаюць грамадскія аб'яднанні і бізнес. Без гэтых партнёраў глабальных мэт будзе складана дасягнуць. Мы сумесна абмяркуем тыя падыходы, па якіх будзем працаваць у краіне», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. Акрамя таго, яна лічыць, што для дасягнення глабальных мэт неабходны комплексны падыход, які прадугледжвае выбудоўванне работы як на нацыянальным, так і на рэгіянальным узроўні. «Толькі спецыялісты могуць даць дакладную ацэнку развіцця эканомікі, адукацыі, аховы здароўя і іншых сфер. Таму ўсе яны аб'яднаныя на месцах у сектаральныя групы, якія праводзяць ацэнку і ўносяць прапановы», — патлумачыла намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Таксама яна адзначыла, што цяпер ідзе распрацоўка палажэнняў для ўключэння ў нацыянальную сістэму развіцця эканомікі да 2035 года.

Бізнес таксама зацікаўлены ў выпрацоўцы стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны, якая паўплывае на стварэнне ўмоў для эфектыўнай занятасці, вырашэнне сацыяльных і экалагічных пытанняў. Дзелавая супольнасць хоча прапанаваць уладзе здаровы сімбіёз у гэтых кірунках. **Старшыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір КАРАГІН** лічыць, што дзяржаве сёння патрэбна дакладная экспертыза для фарміравання стратэгіі па дасягненні МУР, а бізнес гатовы падзяліцца напрацоўкамі.

«Прадстаўнікі бізнес-супольнасці ўключаны ў рабочыя групы, грамадска-кансультацыйныя саветы. Гэта значыць, непасрэдна ўдзельнічаюць у фарміраванні стратэгіі і падрыхтоўцы дакументаў. Яны робяць аналітыку, адкрыта выказваюць сваё меркаванне. Гэта актыўная пазіцыя і канструктыўная работа», — патлумачыў Уладзімір Карагін. Акрамя таго, ён выказаў меркаванне, што паміж беларускім бізнесам і ўладай ужо сфарміраваўся ўстойлівы дыялог.

«Я бачу, што ў кожнай з глабальных мэт ААН ёсць элемент, які датычыцца людзей з інваліднасцю і ў якім яны могуць удзельнічаць непасрэдна. Таму разам з уладай і партнёрамі мы таксама хочам быць уключанымі ў працэсы па змене жыцця да лепшага, — гаворыць **старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Яўген ШЫЎКО.** — Для нашай асацыяцыі — у тым ліку, таму што Беларусь прыняла Канвенцыю па правах інвалідаў і цяпер пераглядае заканадаўства і падыходы да людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Мы таксама робім свой уклад у гэтую работу».

21-22 лютага ў Беларусі пройдзе рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў па дасягненні МУР, на які запрошаныя ў тым ліку і прадстаўнікі ААН.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

НАФТА ПАСКОРЫЛА ЎЗДЫМ

Сусветныя цэны на «чорнае золата» абнавілі максімумы са снежня 2014 года. Кошт сакавіцкіх ф'ючарсаў на паўночнаморскую нафтавую сумесь маркі Brent на лонданскай біржы ICE Futures перавысіў 71 долар за бараль, перадае «Інтэрфакс». Расцэнкі на нафту маркі WTI ўпершыню з 5 снежня перавысілі ўзровень у 66 долараў за бараль. Рынак падтрымліваюць запэўніванні ключавых вытворцаў АПЕК + у тым, што экспарцёры працягваюць супрацоўнічаць пасля заканчэння здзелкі па скарачэнні нафтаздабычы.

ШВЕЙЦАРСКІ КАНТОН ЦУГ СТАНОВІЦЦА ЦЭНТРАМ ІНДУСТРЫІ КРЫПТАВАЛЮТ

За апошнія два гады тут з'явілася больш за 200 стартапаў, звязаных з тэхналогіяй блокчэйн, перадае Euronews. Аб трэндзе сведчыць і неафіцыйная назва кантона — «біткойновая даліна». «Мы называем яго так таму, каб правесці паралелі з Сіліконавай далінай. Тое, што адбываецца тут цяпер, мае шмат агульнага з тым, што было ў Сіліконавай даліне ў 1990-х», — кажа прадпрымальнік Маціяс Рух. Нізкія падаткі і агульная лаяльная палітыка мясцовых улад у дачыненні да крыптавалют прыцягнула ў кантон і кітайскі майнінгавы гігант Bitmain Technologies, які абвясціў аб стварэнні філіяла ў Цугу.

ПАПА РЫМСКІ ПАРАЎНАЎ ФЭЙКАВЫЯ НАВІНЫ СА ЗМЕЕМ-СПАКУСНІКАМ

Папа Рымскі Францыск заклікаў супрацьстаяць распаўсюджванню фэйкавых навін, заўважыўшы, што першы выпадак дэзынфармацыі зафіксаваны яшчэ ў Бібліі, калі Ева паддалася спакусе і спазнала забаронены плод. Паводле яго слоў, гэта ілюстрацыя цяжкіх наступстваў, якія можа прынесці адпаведная інфармацыя. Францыск таксама заклікаў карыстальнікаў сацсетак і журналістаў да выкрыцця такіх навін. Па словах Папы, лепшае процідзеянне ад ілжывай інфармацыі — людзі, якія гатовыя прыкладаць намаганні для пошукаў ісціны. Паводле яго слоў, у сучасных умовах прафесія журналіста становіцца не проста працай, а місіяй.

■ Гарадская гаспадарка

ПАМЯШКАННІ ПАД СТВАРЭННЕ БІЗНЕСУ — БЯСПЛАТНА

«Мінскгармаёмасць» спрабуе дапамагчы сталічным прадпрымальнікам

З нулявой стаўкай арэнды здаюцца памяшканні, што не выкарыстоўваюцца, у якіх неабходна зрабіць рамонт. Усе яны размешчаны на першых або цокальных паверхах у жылых дамах. Месца для развіцця свайго малога бізнесу прапануецца падабраць з 77 аб'ектаў на ўсёй тэрыторыі сталіцы: на сайце Мінгарвыканкама можна знайсці інтэрактыўную карту і падрабязнасці заключэння дагавора.

Як паведаміла **дырэктар фонду «Мінскгармаёмасць» Галіна СЦЕПУРЭНКА,** галоўная ўмова для арэнды — стварэнне новых працоўных месцаў. Акрамя таго, прадпрымальнік павінен прадставіць бізнес-план з разлікамі, колькі ён укладзе грошай і калі іх зможа «адбіць». На аснове гэтага будзе вызначана, на які тэрмін ён вызваляецца ад аплаты арэнды. Праз некалькі гадоў менавіта яму, калі будуць выконвацца ўсе правілы, будзе дадзена права прыярытэтнага прадаўжэння дамовы арэнды без аўкцыёну, прычым аплачваць яе прадпрымальнік будзе па самых нізкіх стаўках, устаноўленых заканадаўча.

Памяшканні можна прыстасаваць, напрыклад, пад трэнажорную залу, склад, офіс, швейную вытворчасць, творчую майстэрню, аб'ект грамадскага харчавання, выставачную залу, праектнае бюро і інш. Пакуль больш за ўсё цікавасць выклікаюць аб'екты, дзе можна размясціць цырульню або краму.

Акрамя таго, 348 мінскіх прадпрымальнікаў летась атрымалі прэферэнцыі па памеры арэнднай платы на 2,6 млн рублёў. Па словах дырэктара фонду, у сталіцы прытрымліваюцца гнуткай сістэмы ўстанаўлення ставак арэнды, гэта адзін са спосабаў падтрымкі прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. Усяго летась было заключана 12 тыс. дагавораў арэнды на нежылыя памяшканні.

Што датычыцца іх продажу, то у 2018 годзе плануецца выставіць на аўкцыён 24 аб'екты нерухомасці: 12 ізаляваных і 12 капітальных будынкаў. Сярод іх ёсць і тыя, якія не ўдалося рэалізаваць летась. Напрыклад, будынак былога дзіцячага сада па вуліцы Лесі Украінкі: патэнцыйныя пакупнікі праяўляюць да яго цікавасць, але прыняць канчатковае рашэнне пакуль не адважваюцца. У гэтым выпадку спраціўвае механізм паніжэння цаны: на 20 %, на 50 % ці на 80 %. Аднак бывае і наадварот: у таргах за некаторыя ізаляваныя памяшканні ўдзельнічалі да 30 прадпрымальнікаў, у выніку цана падымалася ў 7-8 разоў.

Вялікая ўвага ўдзяляецца ўключэнню дзяржмаёмасці, што не выкарыстоўваецца, у гаспадарчы абарот. Зараз да гэтай катэгорыі можна аднесці 190 тыс. м² супраць 239 тыс. м² яшчэ год таму. Павышальныя каэфіцыенты да ставак падатку на нерухомасць і зямлю прымяняюцца і да тых, хто выкарыстоўвае аб'екты неэфектыўна: на гэты момант іх у спісе 116.

Галіна Сцепурэнка таксама расказала пра рэканструяванне будынка аўтавакзала «Усходні», якім зоймецца КУП «Мінскзнешгандальінвест». Аб'ект будзе кардынальна зменены і пераабсталяваны пад гарадскі выставачны цэнтр, дзе дзяржаўныя прадстаўніцтвы іншых краін змогуць дэманстраваць свае дасягненні. Магчыма, у вольны час пляцоўкі будуць здавацца пад кірмашы. Пакуль праект знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, аднак рэканструкцыя можа пачацца ўжо сёлета.

Дар'я КАСКО.

■ Грошы

995 РУБЛЁЎ

Столькі склаў сярэдні заробак беларусаў за снежань

Па рэгіёнах велічыня налічанай сярэднямесячнай заработнай платы адрозніваецца. У сталіцы заробак за снежань склаў 1360 рублёў, у Мінскай вобласці — 967, у Брэсцкай — 899, у Гродзенскай — 894, у Гомельскай — 893. На Магілёўшчыне і Віцебшчыне гэта сума раўнялася 855 і 836 рублям адпаведна.

Сферы, у якіх сярэдні заробак перавысіў тысячу рублёў, — гэта прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, выдавецтва, інфармацыйныя тэхналогіі, фінансавая дзейнасць і страхаванне, навука. Менш за ўсё, па статыстыцы, атрымлівалі работнікі цырульняў і салонаў прыгажосці (у сярэднім 494 рублі ў месяц), сацыяльныя работнікі (553 рублі), бібліятэкары і музейшчыкі (558).

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■ Надвор'е

ІЗНОЎ ХЛЮПОТА НА ДВАРЭ...

У апошнія дні студзеня пацяплее месцамі да плюс 5 градусаў

Мароз пратрымаўся ў Беларусі нядоўга, і з сярэдзіны гэтага тыдня на тэрыторыю нашай краіны накіравалася цёплае паветра з паўднёвага захаду Еўропы. Тэмпературны фон павысіўся, па паўднёвым захадзе краіны — да адлігі. Да канца студзеня ў Беларусі чакаецца сырое надвор'е з тэмпературным фонам вышэй за кліматычную норму, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі краіны вызначае цёплая вільготная паветраная маса, па паўночнай частцы краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Пераважна па поўначы Беларусі пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, чакаецца слабы галалёд. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

У суботу ў паўночна-заходніх, а днём і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Уначы — мінус 2—8 градусаў, па паўднёвым усходзе пры невялікай воблачнасці паветра астудзіцца да 9—12 марозу. Удзень ад нуля да мінус 6 градусаў, у заходніх раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — 1—2 цяпла. На большай частцы тэрыторыі краіны ў нядзелю пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх падлікаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е ў Беларусі будуць фарміраваць атмасферныя франты. У панядзелак і аўторак у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). Ападкі будуць суправаджацца парывістым ветрам. Месцамі чакаецца туман, галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Уначы — ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, удзень — ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Гандбол. Чэмпіянат Еўропы

ТОП-10: ПРАВАЛ ЦІ ПОСПЕХ?

Зборная Беларусі завяршыла выступленне на чэмпіянаце Еўропы

Кантынентальнае першынства ў Харватыі нашы гандбалісты пачалі з перамогі, вікторыяй яго і завяршылі. Нагадаем, што на групавой стадыі намі былі абыграны аўстрыйцы, і гэта стала залогам выхаду беларусаў у асноўны раўнд турніру. Хоць пазней падапечныя Юрыя Шаўцова і саступілі нарвежцам, з якімі, нягледзячы на сваю маладосць, змагаліся на роўных, а потым прайгралі адным з сусветных фаварытаў — французам.

Далей нашай камандзе супрацьстаялі сапернікі не слабейшыя — Швецыя, Харватыя і Сербія. І калі матч са скандынавамі беларусы адкрыта прайгралі, то гульня са зборнай Харватыі пакінула шмат пытанняў, перш за ўсё да суддзяў, якія наўпрост паўплывалі на зыход паядынку. Завяршыўшы перамогай над сербамі сваё выступленне на чэмпіянаце Еўропы, зборная Беларусі замкнула дзясятку лепшых каманд кантынента. Сваю ацэнку гульні каманды даў **галоўны трэнер Юрый ШАЎЦОЎ:**

— Я задаволены тым, як прайшоў для нас гэты турнір. Так, у табелі аб рангах мы засталіся на тым жа месцы, дзе былі два гады таму. Але, у адрозненне ад ЕЎРА-2016, на гэтым турніры дрэнна правялі мы толькі адзін матч. Гаворка ідзе пра сустрэчу са зборнай Швецыі. Шмат матчаў каманда адыграла з другімі нумарамі на пляцоўцы. І гэтыя хлопцы, многія з якіх упершыню выступалі на дарослым топ-турніры, на роўных змагаліся з тымі ж нарвежцамі, французамі і харватамі. Для каманды гэта станоўчы момант. І мяне, як галоўнага трэнера зборнай, гэты факт вельмі радуе. Думаю, у Харватыі мая каманда паказала добры гандбол. І гэта адзначаюць усе спецыялісты тут.

У той час як зборная Беларусі ўжо знаходзіцца дома, у Харватыі пачынаюцца першыя паўфінальныя матчы. Сёння ў Заграбе сустрэнуцца дзеючыя чэмпіёны свету — французы і зборная Іспаніі (пачатак гульні ў 20.00). Услед за імі на пляцоўку выйдуць гандбалісты Даніі і Швецыі (22.30).

Пераможцы паўфінальных сустрэч у нядзелю, 28 студзеня, згуляюць у паядынку за чэмпіёнскі тытул, а тыя, хто прайграў, паспрачаюцца за бронзавыя ўзнагароды.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■ На слыху

НА ЭЛЬБРУСЕ ПРАПАЛІ СУАЙЧЫННІКІ

Такая інфармацыя з'явілася ўчора на сайце галоўнага ўпраўлення МНС Расіі па Кабардзіна-Балкарскай Рэспубліцы.



У прыватнасці, паведамляецца, што ўчора ранкам у цэнтр упраўлення ў крызісных сітуацыях галоўнага ўпраўлення МНС Расіі па Кабардзіна-Балкарскай Рэспубліцы паступіла паведамленне пра тое, што група з Беларусі ў колькасці двух чалавек з 17 студзеня не выходзіць на сувязь. Як паведамляецца далей, турыстычная група не была зарэгістравана. Адразу пасля паступлення сігналу аб знікненні людзей на пошукава-выратавальныя работы на ўсходні бок гары Эльбрус выправілася група ратавальнікаў Эльбрускага высакагорнага пошукава-выратавальнага атрада ў колькасці васьмі чалавек і адной адзінкі тэхнікі. Інфармацыя, якая паступіла, удакладняецца, пазначана на сайце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ТАТА П'ЯНЫ, А Ў КАЦЕЛЬНАЙ ВАДА ЦЯЧЭ»

Каля 7 гадзін вечара ў сераду ў цэнтры аператыўнага рэагавання Рэчыцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях раздаўся незвычайны званок. Дзяўчынка, задыхаючыся ад слёз і хвалявання, перарывістым голасам расказала наступнае. З ацяпляльнага катла, які знаходзіцца ў доме, дзе яна жыве, выцякае гарачая вада і ўзнімаецца дым.

— Тата п'яны, а ў кацельнай вада цячэ! Тут вельмі многа вады! Мне вельмі страшна! Кіпень, яшчэ і дым! Прыязджайце хутчэй!

Дома, акрамя чатырохгадовага брата, знаходзіўся яшчэ і бацька. Але, знаходзячыся нападпітку, ён спаў. Дзяўчынка паспрабавала раскатурхаць бацьку, але той праз п'яны сон адправіў іх да маці, якая знаходзілася на рабоце.

— Калі на месца падзей прыбылі нашы падраздзяленні, то аказалася, што ў памяшканні кацельнай прарвала трубу ўвода ў кацёл, — кажа **афіцыйны прадстаўнік МНС Беларусі Віталь НАВІЦКІ.** — Гарачая вада разлілася, а пару ад яе дзеці і палічылі за дым... Адметна, што дзяўчынка дапамагла брату апрануцца і выйсці на вуліцу, дзе і чакалі ратаўнікоў. Нашы спецыялісты адразу ж пасля прыезду патэлефанавалі маці на работу і дачакаліся яе прыходу.

Сітуацыя пагражала рэальнай небяспекай. Кіпень мог выклікаць вельмі моцныя апёкі. І дзякуючы кемлівасці шасцігадовай дзяўчынкі ніхто не пацярпеў.

— Наша тэхніка выехала б у любым выпадку, — працягвае Віталь Навіцкі. — Бо дзеці не павінны заставацца адны, незалежна ад таго, што адбываецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Страта

Пайшла з жыцця Людміла Сенчына

Народная артыстка Расіі Людміла Сенчына памерла ў Санкт-Пецярбургу ва ўзросце 67 гадоў. Пра гэта «Інтэрфаксу» паведаміў яе прадзюсар Уладзімір Андрэеў.

Па словах Андрэева, перад смерцю Сенчына паўтара года змагалася з цяжкай хваробай. Яна памерла ў бальніцы. Людміла Сенчына нарадзілася ў снежні 1950 года ў Мікалаеўскай вобласці, у паўднёвай частцы Украіны. Яна набыла вядомасць дзякуючы выкананню песні «Папялушка» на навагоднім «Блакітным агеньчыку». У рэпертуары спявачкі былі такія кампазіцыі, як «Цэлую ноч салавей нам насвістваў...», «Палын», «Адкрыццё» і «Добрая казка». Сенчына таксама здымалася ў кіно. Яна сыграла ў такіх стужках, як «Узброены і вельмі небяспечны», «Пасля кірмашу» і «Чароўная сіла».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнай артысткі Расіі Людмілы Сенчынай у сувязі з яе смерцю. «Пайшла з жыцця выдатная спявачка, якая пакарала слухачоў пранікнёным голасам, непаўторнай манерай выканання і велізарным асабістым абаяннем. Яе пяшчотныя, лірычныя музычныя творы, якія сталі неад'емнай часткай савецкай эстрады, заўсёды абуджалі самыя светлыя і добрыя пачуцці», — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на беларускай зямлі творчасць Людмілы Сенчынай добра ведаюць і любяць

■ На тэму дня

АДКРЫЦЬ ДАРОГУ ДЛЯ БІЗНЕСУ ЗА 10 ХВІЛІН

Прадстаўнікі мытных органаў адзначаюць істотны рост грузапатокаў у бок нашай краіны. Па інфармацыі прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК), праз мяжу ЕАЭС летась увезена на 16 % больш тавараў (у тым ліку транзітных) у параўнанні з 2016 годам. Аб'ём тых тавараў, што вывозяцца, павялічыўся на 14 %. У такіх умовах забяспечваць бяспеку мяжы па-старому не атрымаецца. Каб захаваць эканамічныя інтарэсы Беларусі, неабходна пастаянна мадэрнізаваць інфраструктуру. Толькі так можна эфектыўна змагацца з кантрабандай і незаконным абаротам наркотыкаў. Таксама гэта дасць магчымасць стварыць бяспеку на іміджавай падзеі для краіны Еўрагульняў-2019. Акрамя таго, важна пры гэтым улічваць інтарэсы беларускага бізнесу, развіццё якога сёння патрабуе высокай прапускной здольнасці грузаў. Пра тое, як знайсці баланс паміж бяспекай і хуткасцю, расказаў падчас прэс-канферэнцыі старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрый СЯНЬКО.

Час эксперыментаў

Па словах Юрыя Сянько, Дзяржаўны мытны камітэт пастаянна ўдасканальвае і нават кардынальна мяняе тэхналагічную частку сваёй работы. Гэта накіравана ў першую чаргу на тое, каб стварыць для беларускага бізнесу безбар'ерныя ўмовы. Ён нагадаў, што менавіта ў нашай краіне ўпершыню сярод членаў ЕАЭС былі апрабаваны праекты па аўтаматызацыі мытнага працэсу. Агульная колькасць экспартных, імпартных і транзітных дэкларацый на тавары, выпушчаныя ў аўтаматычным рэжыме, летась склала 91 тысячу. Па словах Юрыя Сянько, каб выявіць узровень эканоміі часу за кошт такога эксперымента, трэба зірнуць на справу з пункту гледжання працы пункта пропуску «Казловічы», найбуйнейшага тэрмінала ў нашай краіне. «Усе яго штатныя супрацоўнікі маглі б не працаваць у 2017 годзе два месяцы», — растлумачыў ён. Пры гэтым вызвалены за кошт аўтаматызацыі час у ДМК размяркоўваюць на іншыя ўчасткі, дзе больш патрабуецца інтэлектуальная праца чалавека. У планах на 2018 год — працягваць удасканальваць аўтавыпуск.

Доля партый тавараў, што ўвозяцца на мытную тэрыторыю ЕАЭС, час выпуску якіх не перавысіў дзвюх гадзін, склала 53,5 %, удакладніў Юрый Сянько. А 76 % партый тавараў, што падлягаюць пад працэдуры мытнага транзіту, выпушчана на працягу 10 хвілін.

Ад мабільных праграм да мадэрнізацыі

Як адзначыў Юрый Сянько, цяпер у ДМК вядуць работу па прасоўванні шасці праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Да іх адносіцца ўстаноўка інспекцыйна-нагляднага комплексу ў пункце пропуску «Бераставіца», мадэрнізацыя пункта пропуску «Урбаны», паляпшэнне інфраструктуры пункта пропуску «Грыгароўшчына». Таксама запланаваныя праекты на конкурснай аснове: мадэрнізацыя лакальна-вылічальных сетак, набыццё вагавога абсталявання, удасканаленне дзейнасці кіналагічнай службы. Гэтыя праекты атрымалі папярэдняе адабрэнне. Агульная сума інвестыцый складзе каля 9,5 млн еўра. Акрамя таго, па словах Юрыя Сянько, атрымана канцэптуальнае адабрэнне Еўрапейскай камісіі праектаў будаўніцтва інспекцыйна-нагляднага комплексу ў пункце пропуску «Новая Гута» і распрацоўкі праграмы для смартфонаў, якая змяшчае інфармацыю аб чэргах у пунктах пропуску, для грамадзян, якія перасякаюць дзяржаўную мяжу. Па словах Юрыя Сянько, паколькі праз краіну праходзяць асноўныя еўрапейскія транспартныя калідоры, то ў мадэрнізацыі айчынных пунктаў пропуску зацікаўлена не толькі Беларусь, але і краіны ЕАЭС і ЕС. «Дзяржаўны мытны камітэт актыўна рэалізуе сумесна з Еўрапейскім саюзам узаемавыгадныя праекты», — растлумачыў ён. У 2017 годзе ДМК актыўна праводзіў работу па прыцягненні рэсурсаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў мэтах мадэрнізацыі мытнай службы. За кошт сумеснага фінансавання з урадам Кітайскай Народнай Рэспублікі рэалізаваны праект будаўніцтва і пастаўкі для мытных органаў інспекцыйна-нагляднага комплексу для кантролю тавараў, што перамяшчаюцца чыгуначным транспартам. Аб'ект уведзены ў эксплуатацыю. Агульная сума прыцягнутых інвестыцый склала больш за 5 млн еўра.

Да Еўрагульняў-2019 гатовыя

Інвестыцыі ў праекты цалкам апраўданыя. Па словах Юрыя Сянько, толькі за мінулы год выяўлена 613 адміністрацыйных правапарушэнняў, аб'ектамі якіх з'яўляліся больш за 9,6 тысячы тон санкцыйных тавараў. Мытнымі органамі распачата 11 крымінальных спраў па фактах прадастаўлення несапраўдных фітасанітарных сертыфікатаў замежных дзяржаў пры мытным дэклараванні плодаагароднінай і рыбнай прадукцыі, незаконны вываз якой у далейшым планаваўся ў Расію.

Таксама, паводле яго слоў, у параўнанні з 2016 годам у 2017-м на 17 % узрасла колькасць узбуджаных мытнымі органамі крымінальных спраў па фактах незаконнага перамяшчэння наркотыкаў (41 справа). На мытні канфіскавана больш за 1 тону наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, што больш чым у 60 разоў перавысіла паказчык 2016 года. Практычна 80 % наркатычных прэпаратаў, у тым ліку цяжкіх наркотыкаў, ішлі транзітам у Расію. У цэлым у 2017 годзе мытныя органы выявілі 32 тысячы парушэнняў мытнага заканадаўства, узбудзілі 209 крымінальных спраў. Падраздзяленні Следчага камітэта па матэрыялах беларускай мытні распачалі 111 крымінальных спраў. З удзелам мытных органаў выяўлена яшчэ 67 злачынстваў.

«Прымаючы пад увагу задачы, якія стаяць перад нашай дзяржавай у сувязі з правядзеннем у 2019 годзе II Еўрапейскіх гульняў, а ў 2021 годзе — Чэмпіянату свету па хакеі сумесна з Латвіяй, ужо сёння праводзяцца неабходныя мерапрыемствы па павышэнні бяспекі межаў, бесперашкодным пропуску грамадзян, паскораным перамяшчэнні праз мытную мяжу тавараў і транспартных сродкаў», — адзначыў Юрый Сянько. Таксама, паводле яго слоў, летась праведзена сумеснае абследаванне гатоўнасці інфраструктуры пунктаў пропуску да прытоку балельшчыкаў на гэтыя мерапрыемствы. Кіраўнік мытнага камітэта звярнуў увагу, што падчас правядзення гульняў будзе прымяняцца спрошчаны парадак мытнага дэкларавання пры часовым увозе на мытную тэрыторыю ЕАЭС транспартных сродкаў для асабістага карыстання.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

ПАБУДУЮЦЬ ДВА НОВЫЯ ЦЭХІ ДРЭВААПРАЦОЎКІ

Сучасныя аб'екты з'явяцца на базе Пружанскага і Петрыкаўскага лясгасаў. Будаўніцтва цэхаў будзе праведзена ў рамках выканання галіновай Праграмы прамысловага развіцця дрэваапрацоўчых вытворчасцяў Мінлясгаса на 2015—2020 гады.

У прэс-службе міністэрства адзначылі, што летась на тэхнічнае пераабсталяванне дрэваапрацоўчых вытворчасцяў было накіравана больш за 14,2 мільёна рублёў. За гэтыя сродкі атрымалася рэалізаваць 26 праектаў, з іх 6 — па мадэрнізацыі лесапільных вытворчасцяў, 8 — па ўстаноўцы пазіцыйнага абсталявання, 2 — па стварэнні вытворчасцяў па вырабе драўнянага паліва і інш.

Цяпер у сістэме Мінлясгаса дрэваапрацоўчую дзейнасць вядуць 70 цэхаў і сем майстэрнявых участкаў. Летась імі было перапрацавана 3,4 мільёна кубічных метраў драўніны. Тэхнічнае пераабсталяванне вытворчасцяў дазволіла павялічыць аб'ёмы прадукцыі, што выпускаецца.

Мадэрнізацыю дрэваапрацоўчых вытворчасцяў Мінлясгас працягне і сёлета. Акрамя будаўніцтва новых цэхаў, лясгасамі будуць таксама закуплены лініі лесапілавання, сушыльныя комплексы, пазіцыйнае абсталяванне. Акрамя таго, вядзецца пастаянны кантроль па забеспячэнні эфектыўнай загрузкі дзеючых вытворчых магутнасцяў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЯРЭШ ЧУЖЫЯ, А АДДАВАЦЬ ДАВОДЗІЦЦА СВАЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ добра, калі памер працэнтаў напрамую прывязаны да стаўкі рэфінансавання. У дагаворы адпаведная рэмарка выглядае наступным чынам. «Працэнтная стаўка за карыстанне крэдытам з'яўляецца плаваючай і змяняецца з дня змянення стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка».

Дарэчы, многія банкі пасля таго, як стаўка рэфінансавання стала зніжацца, пачалі адмаўляцца ад такой «прывязкі». У гэтым выпадку ў канцы дагавора дробным шрыфтам будзе напісана наступнае. «У крэдытным дагаворы ўказваецца памер працэнтнай стаўкі ў абсалютным значэнні на дату заключэння крэдытнага дагавора. Пры змене стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка памер працэнтнай стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах не змяняецца, калі іншае не прадугледжана крэдытным дагаворам». На гэтыя акалічнасці трэба звяртаць увагу непасрэдна перад падпісаннем дагавора. Бо пасля падпісання застаецца адно — выконваць.

Без даведак, але дорага

А некаторыя банкі праяўляюць нават залішнюю лаяльнасць да кліентаў. Адна такая фінансавая ўстанова прапануе суму грошай да 10 тысяч рублёў наогул без даведак аб даходах. Праўда, кліент павінен быць «спраўным спажыўцом» банка або мець банкаўскую крэдытную картку адпаведнага статусу. Але і ў гэтым выпадку пазычаныя грошы абыдуцца на 2-3 працэнты дарожэй, чым у выпадку з даведкамі і паручыцелямі.

А яшчэ на айчынным фінансавым рынку з'явілася прапанова «Крэдыт — усё ўключана». Гэты крэдытны дагавор заключаецца на тэрыторыі кліента з дастаўкай грошай яму непасрэдна дадому. У гэтым выпадку такі крэдыт будзе амаль залаты: працэнтная стаўка значна вышэйшая за звычайную — не менш за 27 % гадавых.

Перавагі дыстанцыйных крэдытаў

Самае дарагое ў банкаўскай сферы — гэта работа з кліентамі. Спажыўца трэба абслугоўваць, яго трэба пераканаць. Ідэальны кліент — той, хто ўсё для сябе вырашыў і самастойна афарміў у выглядзе анлайн-заяўкі на сайце банка.

У Беларусбанку, напрыклад, з мэтай атрымання крэдыту заяўнік можа звярнуцца ў любую з устаноў банка альбо запоўніць заяўку на крэдыт на карпаратыўным вэб-сайце, у інфакіёсках банка або з выкарыстаннем сэрвісу М-банкінг ці падаць заяўку на крэдыт праз Кантакт-цэнтр, звярнуўшыся па кароткім нумары тэлефона.

Там жа крэдыты могуць быць афармленыя без паручыцеляў. Акрамя таго, пазыку заключаюць без прадастаўлення даведкі аб даходах у памеры, разлічаным, зыходзячы з сярэднямесячнага чыстага даходу, які не перавышае 15 базавых велічынь. Афармленне крэдыту (незалежна ад памеру) грамадзянам, якія атрымліваюць заработную плату (пенсію) ва ўстановах банка магчыма без прадастаўлення даведкі аб даходах.

І галоўнае — працэнты па такіх дыстанцыйных крэдытах крыху ніжэйшыя, чым пры звычайным фармаце. Пакуль толькі на 0,5 % менш, але і тое хлеб.

Эфектыўныя грошы на жыллё — 24 і 18

Яшчэ летась істотна патаннелі і крэдыты на будаўніцтва (рэканструкцыю) індывідуальных жылых дамоў і кватэр. Напрыклад, цяпер Беларусбанк прапануе грошы на гэтыя мэты на тэрмін да 20 гадоў. На працягу першых 24 месяцаў доўжыцца льготны перыяд крэдытавання: працэнты па такім крэдыце роўныя стаўцы рэфінансавання Нацбанка. Пачынаючы з 25-га месяца «ўключаюцца» агульныя ўмовы — стаўка рэфінансавання плюс тры працэнтныя пункты за фактычны час карыстання. Грошы выдаюцца на суму да 90 % ад кошту будаўніцтва (рэканструкцыі) жылога памяшкання ў межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка. У банку ўдакладнілі, што пры разліку памеру крэдыту пры недастатковай плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка па рашэнні крэдытнага камітэта ў яго сукупны даход могуць уключацца даходы паручыцеляў — блізкіх сваякоў (членаў сям'і) крэдытаатрымальніка (жонкі, мужа, бацькоў, родных братоў (сясцёр), дзяцей, унукаў).

❍ Да ведама

Пры разліку мінімальнай заработнай платы, неабходнай для атрымання крэдыту, банкі, як правіла, да максімальнага плацяжу дадаюць бюджэт пражытачнага мінімуму, плацяжы па іншых крэдытах, растэрміноўку, часам камунальныя плацяжы, аплату паслуг сувязі і плату за арэнднае жыллё. З разлікам максімальна магчымай сумы не ўсё так проста. Методыка для разліку ў кожнага банка свая, у выніку сумы крэдыту ў розных банках пры адной і той жа зарплаце могуць адрознівацца ў некалькі разоў.

Пэўная сума выдаецца крэдытаатрымальніку пры наяўнасці паручыцеляў. Калі сума звыш 50 тысяч рублёў, то яе дадуць толькі пад заклад будучай маёмасці. Такім чынам, у нас дэ-факта працуе механізм іпатэкі.

Трэба мець на ўвазе, што ў крэдытным дагаворы прапісваецца памер працэнтнай стаўкі, якая плавае і змяняецца з дня змянення стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка.

Пры будаўніцтве жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах пагашэнне асноўнага доўгу па крэдыце ажыццяўляецца з наступнага месяца пасля заканчэння 18 месяцаў, якія ідуць за месяцам прыёмкі ў эксплуатацыю закончанага будаўніцтвам аб'екта нерухомасці, але не пазней чым праз тры гады пасля заключэння крэдытнага дагавора.

Падлічваем старыя даўгі

На фоне пастаяннага зніжэння працэнтных ставак па крэдытах усё большая цікавасць назіраецца да крэдытаў на рэфінансаванне запазычанасці. Нагадаем, што крэдыт на рэфінансаванне даецца для таго, каб пагасіць запазычанасць па старым крэдыце.

У крэдытаў на рэфінансаванне ёсць свае асаблівасці. Для прыцягнення кліентаў банкі ўстанаўліваюць стаўку, якая звычайна ніжэйшая, чым па нядаўна выдадзеных крэдытах «наяўнымі». Яшчэ адна асаблівасць: банкі рэдка рэфінансуюць уласныя крэдыты, але з задавальненнем «перакупляюць» запазычанасць іншых банкаў. Гэта тлумачыцца проста: важна прыцягнуць новых кліентаў і не моцна змяняць бягучыя ўмовы тым, што ўжо ёсць. Крэдыты на рэфінансаванне цяпер выдаюць 18 банкаў.

За кошт рэфінансавання стаўка па крэдыце істотна зніжаецца, штомесячны плацеж робіцца меншы амаль у два разы. Але ўвесь тэрмін крэдыту павялічваецца, таму фактычнага скарачэння выплат па працэнтах звычайна не бывае. Таму ў кожным выпадку да афармлення новага крэдыту трэба падыходзіць уважліва. Параўноўваць варта не толькі штомесячны плацеж (на чым робяць упор банкі ў сваёй рэкламе), але і выніковую суму пераплаты.

Сяргей КУРКАЧ.

Зубр карове — сябар

Крыху больш за год таму мы пісалі, якога клопату нарабіў зубр, які прыбіўся з Белавежскай пушчы да статка кароў сельгаспрадпрыемства «Любань» Кобрынскага раёна. Лясны звер спачатку блукаў па навакольлі, схадзіў ва Украіну, але сваімі зубрынымі мазгамі, нарэшце, дапяў, што нідзе няма лепш, як на добрых кармах ды чыстай вадзе, якімі забяспечваюць калгасны статак. Ды і рагулі яго ўвагай не абдзялілі.

За месяц такога пражывання пушчанскі госць зрабіўся гладкі, поўсць заблішчэла, больш за тое, стаў паводзіць сябе як важак і гаспадар статка. Напрыклад, тыдзень не падпускаў людзей да нованароджанага цяляці. Праз паўтара месяца ўсё ж зубра забралі ў пушчу, цяпер ён жыве ў вальеры, яго паказваюць экскурсантам і расказваюць гісторыю вандровак.

А цяпер вось паявілася інфармацыя процілеглага кшталту. Карова прыбілася да зуброў, праўда, з польскага боку пушчы. Небараку хацелі адправіць на бойню. Але яна раптам знікла. Нашы спецыялісты каментуюць на сваіх сайтах, што гэта анамалія: карова не можа стаць членам зубрынага статку. Але ж ёсць такое меркаванне, што каровы адчуваюць, калі іх вядуць на забой. І зубры маглі даўно прагнаць, нават забіць чужынку, але ж яна жыве побач з ляснымі волатамі ўжо тры месяцы. Значыць, і жывёлы здатныя на цярпімасць, спагаду.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Утерянный представительством Белгосстраха по Октябрьскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНК № 1166551 **считать недействительным.**

В суд Фрунзенского района г. Минска поступило заявление о признании умершим Босько Иосифа Станиславовича, 19 апреля 1962 года рождения, уроженца д. Трудовая Щучинского района Гродненской области, последнее известное место жительства: г. Минск, ул. Бельского, д. 8, кв. 57.

Просьба ко всем гражданам, располагающим какими-либо сведениями о Босько Иосифе Станиславовиче, сообщить их суду Фрунзенского района г. Минска в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона			
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703		
Продавец	Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24		
Предмет аукциона Местоположение – Минская обл., Минский р-н			
Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (населенный пункт)
Лот № 1			
Здание магазина № 36	150 кв. м	600/С-155271	Шершунский с/с, д. Рогово, ул. Гастелло, 4А
Составные части и принадлежности: пристройка, хоз. блок			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0771 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина № 36 (срок действия по 29.09.2043) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка»)			
Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 19 900,00 бел. руб. (снижена на 60 %)			
Лот № 2			
Магазин № 37	37,5 кв. м	600/С-139783	Роговский с/с, д. Чировичи, 17А
Составные части и принадлежности: пристройка			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина № 36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка»)			
Начальная цена лота №2 с НДС 20 % – 1 500,00 бел. руб. (снижена на 60 %)			
Лот № 3			
Заготовительный павильон	257,2 кв. м	600/С-153282	г. Заславль, ул. Набережная, д. 2Г
Составные части и принадлежности: пристройка			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина № 36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка»)			
Начальная цена лота №3 с НДС 20 % – 59 000,00 бел. руб. (снижена на 35 %)			
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»			
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона			
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by			
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2017 г.			
Аукцион состоится 14.02.2018 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 12.02.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. **Email: auction@cpo.by**			

ЗАПАВЕТЫ СЕЛЯНІНА МАЛЯНКОВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба сказаць, што хлебасольны гаспадар рады гасцям і шчыра іх прымае. Для такіх выпадкаў на стале з'яўляецца натуральнае чырвонае віно, марынаваныя белыя грыбы, салаты са сваёй гародніны, вялізная патэльня з судаком і, вядома, хлеб уласнай выпечкі.

Адкуль гэта пайшло

Малянкоў кажа, што ўсё пачалося з нараджэння сына. Чым яго карміць? Прадукты з крамаў не задавальнялі з-за вялікага пераліку рэчываў, што пішуць на ўпакоўках. Тады і вырашыў паступова пераходзіць на сваё харчаванне. Пачаў з галоўнага прадукту — з хлеба. Асвоіў пякарскую справу яшчэ ва ўмовах гарадской кватэры. Муку набываў не ў краме, а з арганічных палёў Краснадара. У гэты ж час пачаў шукаць найбольш спрыяльную мадэль жыццёвага ўкладу.

якое выдзелена мясцовымі ўладамі, Малянкоў вырашыў пасадзіць бульбу.

— Буду зямлю апрацоўваць, — кажа ён, — ужо і насенне набыў у Пружанах, вядома ж на арганіцы, навошта людзей труціць? Нават ад жукоў не будзем апрацоўваць, а збіраць іх спецыяльным прыстасаваннем. Яго яшчэ 15 гадоў таму ў аграрным універсітэце сабралі, гэта доследны ўзор, але так і не задзейнічаны.

Што датычыцца збыту, бульбу, хутчэй за ўсё, павязуць на продаж у Расію. Пакуль на заробак не вельмі разлічваюць, хоць прадукт і арганічны. Але ўсё будзе залежаць ад попыту. Здаецца, што прыбытак ад рэалізацыі Малянкова мала хвалюе.

«Дамастрой»

Дом уяўляе сабой адкрытую прастору, дзе і кухня, і гасцёўня, і пліта, і печка, і яшчэ шмат месца застаецца. Асаблівая ўтульнасць ідзе ад агню і ад

У доме няма тэлевізара і ўсялякіх гаджэтаў. Гэта спрыяе таму, што сям'я часцей бывае разам ці займаецца патрэбнымі для гаспадаркі справамі.

— Нельга сказаць, што ў нас усё гладка, — кажа Аляксандр Малянкоў, — бываюць пэўныя спрэчкі. Але калі ёсць магчымасць не падкрэсліваць асабістыя амбіцыі, навошта гэта рабіць?

Для Дар'і пераезд у вёску не стаў катастрофай. Яна лічыць, што ў кожным з нас закладзена нешта сялянскае, памяць продкаў. Гэта яна адчула, калі ўпершыню пераступіла парог дома.

— Як увайшла, зразумела, што я ў сваім доме, я тут гаспадыня, хоць вёска раней і палохала, бо праца тут цяжкая, — тлумачыць яна. — Але мы нярэдка выязджаем, вандруем па розных краінах. Але вось дзіва: у гасцініцах, нават самых лепшых, нам цяжка спаць, быццам паветра не тое. Толькі калі вяртаемся дамоў, адчуваем сябе камфортна.

Дзівак ці гаспадар?

Малянкоў зарэгістраваў сялянскую гаспадарку і ўзяў курс на арганічнае земляробства. Адным з важных здабыткаў у гэтай справе лічыць выдзяленне яму зямельнага ўчастка.

— Я заявіў аб сваім жаданні, і мне далі зямлю, — кажа Аляксандр, — і няважна, якая там глеба. Галоўнае — ёсць, з чаго пачаць.

Адступаць ад сваёй мэты Малянкоў не збіраецца, бо сам доўга да яе ішоў. Каб гадоў дзесяць таму яму хто сказаў, што з Масквы ён вернецца ў Гродна, а затым яшчэ ў маленькую вёсачку, не паверыў бы. І зразумела: у чалавека за плячыма дзве вышэйшыя эканамічныя адукацыі, будаўнічы бізнес. Але пошукі духоўнасці і правільнага ўкладу жыцця прывялі ў вёску. Аляксандр стаў глыбока веруючым і абавязкова перахрысціцца перад вялікім драўляным крыжам, які паставіў на сваім падворку.

Незвычайная гаспадарка

Аляксандр Малянкоў вядзе на свае «вытворчыя» аб'екты. Іх некалькі. Найперш наведваем пякарню, дзе нядаўна выпеклі каля паўсотні буханак чорнага хлеба. Навошта столькі, пытаюся. Аказваецца, раздае сябрам і знаёмым. Печка яшчэ палае жарам, а на стале ў льняной покрыўцы радамі ляжыць духмяны хлеб. Аснова ўсіх філасофій. Гарант трывалай гаспадаркі. Побач, у халаднейшым пакоі, усталяваны акуратны драўляны млын. Цяпер Аляксандру не трэба купляць муку, дастаткова набыць зерне. Пастаўкі тыя ж — з палёў Растоўскай вобласці. Тут жа гатуецца закваска для сычужных сыроў з казінага малака, а сама абалонка, ці сычуг, сушыцца каля печы. Сыры робяць толькі для сябе, і з магазіннымі, па словах Аляксандра, яны не маюць нічога агульнага.

Але ідзём далей. Праз сотню метраў — яшчэ ўчастак, дзе размешчаны хлеў для коз. Іх тут каля трыццаці. Амаль усе чакаюць прыплод, дзякуючы ў тым ліку важнаму на выгляд казлу Лотасу. Гаспадар плануе давесці статак да 90 галоў. Козы козамі, але будуць яшчэ ў гаспадарцы карова і коні.

На ўчастку ўзводзіцца незвычайны будынак. Сцены са шліфаванага каменя, а па вуглах тоўстыя ствалы дубоў прымураваны. Такая канструкцыя — для таго, каб утрымліваць другі паверх. У гэтым доме гаспадар мяркуе размясціць работнікаў. Іх пакуль не хапае, мала хто хоча працаваць на сялянскай ніве. Але пакуль Аляксандр і сам здольны з многім управіцца, бо бачыць сэнс у працы. Нядаўна яго гаспадарка пашырылася ажно на 50 га. На полі, сцен. Яны выкладзены з тоўстых бярвенняў, быццам без усялякага прамочвання. Можа, і так. У кухонным «адсеку» гаспадарыць жонка Дар'я. Яе галоўны гонар — таўшчэзная дубовая стальніца.

— Яна вельмі зручная, — кажа Дар'я. — можна і гарачае паставіць. Калі, бывае, мужа побач няма, можна нават птушку пасекчы.

Здаецца, ад былой гараджанкі не засталося і следу. Нас сустракае самая сапраўдная сялянка, прычым з мінулага. Доўгая сукенка з поясам, на галаве — хустка. Гэтую «моду» ўвёў муж, кажа Дар'я. Асабліва настойваў на хустцы, бо гэта галоўная прымета замужняй жанчыны. Жонка ў рэшце рэшт згадзілася.

Дар'я размаўляе і накрывае на стол. Вядома, ежу падаюць у гліняных талерках, якія зроблены ў нашых ганчароў, па заказе. Карыстаюцца ў сям'і і драўлянымі лыжкамі, але яны часта ламаюцца, кажа Дар'я. Мусім замяняць металічнымі. Супы вараць у кацялках над агнём. Гледзячы на кухонныя прылады, няцяжка ўявіць танклявую маладую жанчыну з чыгункам у руках альбо з вілкамі. Так яно і ёсць насамрэч. Свае абавязкі ёсць у васьмігадовага сына Сашы — Аляксандра Трэцяга, як прадставіў яго бацька. Напрыклад, у печы распаліць, за курамі паглядзець, вароты зачыняць і нават фіранкі зацягваць. Вядома, ёсць у яго і свае гульні. Цяпер хлопчык узводзіць старажытны замак з гліны. Канструкцыя мацуецца спецыяльным растворам, таму будзе трывалая.

— Здаецца, бязвыхадная сітуацыя, і раптам на роўным месцы грошы з'яўляюцца, — тлумачыць Аляксандр. — Ну, напрыклад, валяліся ў мяне жалезкі непатрэбныя, раптам знаходзіцца пакупнік, і Гасподзь пасылае грошы праз яго.

Ідэямі незвычайных прыезджых пачалі цікавіцца «прасунутыя» вяскоўцы. Некалі іх бацькі і дзяды вялі натуральныя гаспадаркі і не думалі, што яны нечым адметныя. Цяпер драўляны зруб у вёсцы — рэдкасць. Будуюць у асноўным з цэглы ці сілікатных блокаў.

— Маладым варта даваць зямлю і магчымасць будавацца. Дазваляць танна для гэтага набываць лес. І ўсе будуць задаволеныя. Сама па сабе вёска не зменіцца, — упэўнены Малянкоў. — Людзі адвыкаюць працаваць на зямлі. Напрыклад, я доўгі час не магу знайсці памочніка па гаспадарцы, які б хацеў і ўмеў даглядаць свойскіх жывёл, весці агарод. І наш выбар — гэта не штосьці дзівоснае. Мы — звычайная сялянская сям'я. Раней людзі менавіта так і жылі, і былі шчаслівыя...

Маргарыта УШКЕВІЧ.
(Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by)

Извещение о проведении четвертых (последних) повторных торгов по продаже предприятия ОАО «Рыбный ряд» как имущественного комплекса

Начальная цена: 1 414 700,00 BYN. Сумма шага аукциона: 70 735,00 рублей, 00 копеек.

Четвертые (последние) повторные торги в форме аукциона по продаже предприятия как имущественного комплекса (ОАО «Рыбный ряд»).

Сведения о предмете аукциона: предприятие как имущественный комплекс (№ 0001323), созданное на базе Открытого акционерного общества «Рыбный ряд», расположенное по адресу 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, путем продажи на аукционе с начальной ценой продажи: 1 414 700,00 рублей, 00 копеек без учета НДС.

Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 90 дней со дня проведения торгов (согласовано собранием кредиторов ОАО «Рыбный ряд»).

Предприятие расположено на двух земельных участках общей площадью 2,763 га, расположенных по адресам: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16 (2,4774 га), ул. Орловского, 25Б (0,2856 га), предоставленных на праве постоянного пользования.

Условия продажи – нет.

Организатор аукциона: антикризисный управляющий Казяба Сергей Николаевич.

Аукцион проводится 14.02.2018 года в 11.00 по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова 1-й, 16.

Задаток: 141 470,00 рублей, 00 копеек.

Задаток перечисляется: ОАО «Рыбный ряд» 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, УНП 700067281, р\с BY43BLBB30120700067281001001 в ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, БИК BLBBBY2X.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, с 31.01.2018 с 8.30 до 12.30 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17.00 13.02.2018 г.

Сведения о продавце: «Рыбный ряд», 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова 1-й, 16.

За справками обращаться по тел.: (0225) 48-54-41, 48-58-20, (044) 730-22-10, (029) 310-52-83. Информация о составе имущества доступна на сайте www.bankrot.gov.by

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 6 февраля 2018 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением начальной цены на 40 %

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м Подъездной ж/д путь не общего пользования Битумное хранилище, объем 640 тн Битумное хранилище, объем 250 тн Котельная Бытовой корпус Склад сланцевой золы, площадь 66 кв. м Склад сланцевой золы, площадь 52 кв. м Мазутная насосная Ограждение из блоков к битумным емкостям Здание для битумовара Площадка из ж/б плит к КТП Покрытие, площадь 1499 кв. м Мастерская Емкость, объем 60 куб. м Емкость, объем 60 куб. м Емкость, объем 50 куб. м Емкость, объем 50 куб. м Емкость, объем 2 куб. м Нефтерезервуар, объем 4 куб. м Емкость, объем 25 куб. м Емкость, объем 25 куб. м Битумоплавильня, объем 4*10 куб. м Зеленые насаждения Внеплощадные электрические сети Верстак металлический Канализационная сеть	116 616,02	Могилевская область, Бобруйский р-н, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша)	11 661,60

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 06.02.2018 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY91BPSB30121192411129330000, код BPSBBY2X, в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 02.02.2018 г.; время: 17-00.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» № 52 от 18.03.2017 г., № 100 от 30.05.2017 г., № 116 от 21.06.2017 г., № 134 от 15.07.2017 г., № 211 от 01.11.2017 г., № 222 от 17.11.2017 г., № 3 от 13.01.2018 г.

Извещение о проведении повторных торгов по продаже права заключения договора оказания услуг по размещению рекламы на портале авторизации для идентификации абонентов WI-FI сетей

Аукционные торги проводятся **14 февраля 2018 г**. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Организатор торгов – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

№ предмета торгов	Местонахождение WI-FI сетей, осуществляющих идентификацию абонентов через портал авторизации	Вид, количество средства рекламы и иные характеристики	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. в месяц с учетом НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	г. Минск, пл. Привокзальная, 3. Вокзал станции Минск-Пассажирский Витебская область, г. Орша, ул. Заслонова, 3а. Вокзал станции Орша Минская область, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 7. Вокзал станции Молодечно Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 7а. Вокзал станции Борисов Брестская область, г. Барановичи, ул. Фроленкова, д.13. Вокзал станции Барановичи-Полесские Гродненская область, г. Лида, ул. Труханова, 12В. Вокзал станции Лида г. Гродно, ул. Буденного, 37. Вокзал станции Гродно Брестская область, г. Лунинец, ул. Вокзальная, д. 6. Вокзал станции Лунинец г. Брест, ул. Кижеватова, 1Б/1. Вокзал станции Брест-Центральный Брестская область, г. Пинск, ул. Железнодорожная, 19. Вокзал станции Пинск г. Гомель, Привокзальная площадь, 3. Вокзал станции Гомель Гомельская область, г. Жлобин, Привокзальная площадь. Вокзал станции Жлобин Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Октябрьская, д. 30. Вокзал станции Калинковичи г. Могилев, Привокзальная площадь, 1. Вокзал станции Могилев Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Вокзальная, 18. Вокзал станции Осиповичи Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Железнодорожная, 13. Вокзал станции Бобруйск Могилевская область, г. Кричев, ул. Пугачева, 6. Вокзал станции Кричев г. Витебск, ул. Космонавтов, 8. Вокзал станции Витебск Витебская область, г. Полоцк, ул. Октябрьская, 44. Вокзал станции Полоцк	Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации и полноэкранный интернет-баннер. **Интернет-баннер сверху либо снизу портала авторизации (согласно схеме):** длительность показа: постоянно (с возможностью закрытия их пользователем); поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg, flash; размеры: 300×250 пикселей; вид размещения: статический, динамический без аудио-сопровождения. **Полноэкранный интернет-баннер (согласно схеме):** длительность показа: 10 с.; поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; размеры: 468×60 пикселей; оптимизация под экран устройства.	2 085,00	200,00
	*Срок, на который заключается договор оказания услуг по размещению рекламы – **1 год***			

Документы на участие в торгах принимаются с **29.01.2018 по 12.02.2018** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

Порядок оформления участия в торгах: к участию в аукционных торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представившие организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– копию свидетельства о государственной регистрации организации или индивидуального предпринимателя;

– копию устава организации (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора);

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на счет организатора торгов.

Сумма задатка должна быть внесена не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр. Машерова, д. 80, УНП 190398583, (**назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 14.02.2018 по предмету торгов № 1**);

Лицо, подающее документы на участие в торгах, предъявляет документ, удостоверяющий личность. Представитель индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору торгов оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Порядок определения победителя торгов: торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, предмет торгов продается участнику, подавшему единственное заявление на участие в торгах, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Иные условия торгов:

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** обязан возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись.

Цена продажи предмета торгов за вычетом внесенной суммы задатка **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** перечисляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) на текущий (расчетный) счет УП «Минское отделение Белорусской железной дороги».

Цена продажи предмета торгов за вычетом внесенной суммы задатка учитывается в счет оплаты за 1-й месяц оказания рекламных услуг по договору.

Договор оказания услуг по размещению рекламы между победителем торгов (приравненным к нему лицом) и УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» заключается **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов**, при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение.

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения торгов.

Телефон для справок: отдел аукционов – (017) 327-40-22, отдел по управлению государственным имуществом УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» – (017) 255-31-93, (017) 255-31-91. Сайт в сети интернет: www.mgcn.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	– капитальное строение, инв. № 441/С-13231 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание хлебозавода), площадью 3013,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14071 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание трансформаторной подстанции), площадью 37,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14070 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание гаража), площадью 201,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14073 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 236,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14072 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание проходной), площадью 15,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14062 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – благоустройство), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14061 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14060 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14064 (назначение – сооружение специализированное трубопроводного транспорта, наименование – газопровод), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8; – капитальное строение, инв. № 441/С-14063 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422950100001002276, (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений), площадью 1,1980 га, расположенный по адресу г. Ивье
Начальная цена продажи	148 776,00 руб. (сто сорок восемь тысяч семьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	7 440 руб. (семь тысяч четыреста сорок рублей)
Продавец	Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32,
Условия аукциона	Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи. Расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, публикацией извещения в средствах массовой информации и размещением на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества
Условия оплаты	Покупателю предоставляется право рассрочки платежа сроком на 1 год с уплатой первоначального взноса в день подписания договора купли-продажи в размере 20 % от стоимости
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 28 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 22 февраля 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
Дополнительная информация http://grodnoino.by/

НЕЧАКАНЫ «ТРАФЕЙ»

Падчас тэрміновай службы ў радах Узброеных Сіл СССР Міхась прыдбаў сабе шкодную звычку: пачаў курыць. Адмаўляў сабе ў цукерцы і булачцы — на апошнія грошы купляў цыгарэты.

Але ж вось нарэшце адслужыў, прыехаў дамоў.

Перад бацькамі смаліць і страшна, і сорамна (у сям'і спрадвеку ніхто не курыў...), а хочацца — аж вушы пухнуць! Дык ён хавацца стаў.

Жылі яны на ўскрайку мястэчка. Непадалёк там бярозавы гай, і Міхась, калі што, цішком ішоў да свайго «каманднага пункта».

Яго яны з братам зрабілі яшчэ ў школьныя гады, прычым якасна. Таму зараз заставалася толькі залезці на дрэва і ўжо адтуль, пускаючы колцы дыму, аглядаць краявіды, пазіраць уніз на людзей.

Нехта вунь «на гарызонце»... З дзвюма сумкамі.

«Цікава, хто?» — падумаў курэц і хутка пазнаў цётку Франю. Жыла яна непадалёк ад бацькоў, была на пенсіі, але працавала яшчэ на мясакамбінаце — вартаўніком, і з таго, што вартавала, нешта, відаць, выносіла?

— Алё, міліцыя? — не доўга думаючы, у яе над галавой гаркнуў Міхась.

Гэтага было дастаткова, каб жанчына кінула вобзем сумкі і пабегла так, што не дагнаў бы з сабакамі!

Але ж рабіць гэта ніхто не збіраўся.

Хлопец, дакурыўшы чарговую цыгарэту, спакойна злез на зямлю і рушыў да кінутых сумак. Адтуль даносіўся пах свежай вэнджанай каўбасы.

...На ноч гэты неспадзяваны падарунак быў надзейна прыхаваны ў бярэзніку. Пад раніцу Міхась парашыў яго лёс: пустыя сумкі неўпрыкмет перакінуў у двор да цёткі Фані, а каўбасы перадаў сваёй аднакласніцы, якая працавала ў школе-інтэрнаце: набліжаўся Новы год, і там на святочным стале яны былі вельмі дарэчы!

Юрый КАТОВІЧ,
Пастаўскі раён.

ПАД'ЕХАЎ,

альбо Пра тое, як пан Збышак кінуў гарэлку піць

Гэту гісторыю я пачула ў тралейбусе. Яе — і ва ўсіх падрабязнасцях — абмяркоўвалі двое мужчын. Яны сядзелі ззаду, нам было па дарозе, і ехалі мы досыць доўга, таму я даслухала ўсё да канца. Прычым не адна: калі прагучала апошняя фраза, рагатаў ці не ўвесь тралейбус.

...Калі, у якім годзе гэта было — не так ужо і важна. Галоўнае, што было сапраўды. Група расійскіх турыстаў адправілася ў Альпы, каб там адпачыць у час даўгаватых навагодніх, ці, як кажуць у Расіі, Калядных канікулаў: надыхацца чыстым паветрам, накатацца на горных лыжах, налюбавацца прыгожымі пейзажамі, а ўрэшце — проста расслабіцца.

Для вось гэтага, апошняга, турысты з Расіі запасліся вядомай вадкасцю (каб хапіла на ўвесь адпачынак), скрынкамі з ёй заставілі заднія сядзенні і адправіліся ў дарогу.

Тэрыторыю Беларусі іх мікрааўтобус перасёк без прыгод. На мяжы таксама ўсё праходзіла, як той казаў, у штатным рэжыме. А ўжо далей Польшча была.

Едуць па ёй турысты, пазіраюць вакол, і раптам — дзіва: абганяюць дзядзьку на ровары, прычым ён ну так завіхаецца, так спяшаецца... «Можа, у чалавека зрабілася што? Можа, да радні спазняецца», — падумалі турысты і прапанавалі яго падвезці.

Мужчына быў ну вельмі рады, бо яно ж не параўнаць, што ехаць на ровары, а што — на аўтобусе. На ім жа хутчэй і лягчэй, і весялей, тым больш — у кампаніі з рускімі!

Гэтага прызнання турыстам было дастаткова: яны распыталі пана, як яго завуць, куды ён кіруе, а потым налілі яму выпіць — за знаёмства!

Адным гэтым тостам прадстаўнікі двух народаў не абмежаваліся: як і варта было чакаць, паднялі кубачкі за Новы год, за Каляды, за будучы прыемны адпачынак...

За што яшчэ выпіваў пан Збышак, ён, напэўна, ніколі не ўспомніць, бо ў разгар «бяседы» раптам... заснуў. «Ну і няхай», — вырашылі турысты, працягваючы «банкет» і, вядома ж, ні на што не зважаючы, аж пакуль праз нейкую гадзіну-другую сонны пан Збышак не чхнуў... Тады ўжо турысты ўспомнілі, што ён з імі... едзе. Але куды — ніхто з іх не памятаў.

На гарызонце тым часам паказаліся абрысы Варшавы, і расіяне падумалі, што гэта для іх новага знаёмца найзручнейшае месца, што адсюль ён лёгка дабярэцца куды заўгодна...

А таму яны спынілі аўтобус, пасадзілі пана на блізкую лаўку, збоку паставілі яго веласіпед і паехалі сабе на канікулы ў Альпы.

...Праляцелі яны (ва ўсякім разе для турыстаў) як адзін дзянёк — час збірацца дадому. Ва ўсякім разе кіроўца ўзяўся ўжо рыхтаваць аўтобус і падумаў, у прыватнасці, што за адным скрыпам трэба зрабіць рэвізію — паглядзець, што там засталося ў скрынках з гарэлкай?

Поўных пляшак ён знайшоў нямат, і гэта яго не здзівіла. А вось тое, што пад сядзеннем ляжыць нечая пузатая барсетка — вельмі!

Іван асцярожна падняў яе, адкрыў і ўбачыў, што там... поўны камплект дакументаў пана Збышака: ягоны пашпарт, правы, банкаўскія карткі... «Усё ж гэта прыйдзецца ўзнаўляць, — жахнуўся Іван. — Гэта ж колькі клопату будзе!»

Карацей, пашкадаваў ён пана: вырашыў на зваротным шляху (добра, што адрас у пашпарце!) завезці тую барсетку.

Патрэбны дом і кватэру знайшоў, можна сказаць, лёгка — націскаў на кнопку званка — раз другі, трэці. Але дзверы яму ніхто не адчыняў. «Мусіць, дома няма, — здагадаўся Іван і задумаўся — што ж рабіць: пакінуць барсетку тут, пад дзвярыма — дрэнна, забраць яе з сабой — яшчэ горш...»

На шчасце, побач пачуўся шоргат, адчыніліся дзверы:

— Цо пан хцэ́ — з недаверам спытала ў Івана суседка Збышака, пані гадоў сямідзесяці.

— Хцэ́, — перайшоў на польскую Іван, — забачыць пана Збышака.

— Для чэ́го? — працягвала «допыт» жанчына.

— Каб з панам Збышакам выпіць водкі, — жартам прамовіў госць.

— Пан Збышак ніц не пі́е, — гледзячы на Івана, рашуча заявіла суседка.

— І з якога ж, прабачце, часу ён «не пі́е»? — пацікавіўся госць, успомніўшы, што з імі і зусім нядаўна пан добра накаціў — недзе з паўлітра выжлукціў.

— З тэ́го, — сказала пані, — як на свам ровэ́жу дої́хал до Варшавы і потэм ніц не поме́нта! *(нічога не памятае)*.

...Значыць, як ні круці, а сустрэча з рускімі турыстамі была для пана вельмі карыснай! Іншыя ж, для таго каб адмовіцца ад гарэлкі, вялікія грошы плацяць, гадамі лечацца. А пан Збышак проста пад'ехаў, нават не галасуючы.

Таццяна ХАЛОПІЦА,
г. Мінск.

БЕЛАЯ ВАРОНА ЎЖО НЕ БЕЛАЯ...

Неяк свабоднай часінай глядзеў я па тэлевізары канцэрт. Шмат было там розных артыстаў, што спадабалася: адзін з іх выйшаў на сцэну ва ўсім белым. Амаль як я — некалі...

Мне тады было гадоў з дзесяць, у чацвёрты клас збіраўся. Бацькі напярэдадні, як ні цяжка было, рыхтавалі абноўкі. Раней, як правіла, перашывалі, з нечага старога, а ў той год пашылі з новага: са свайго саматканага палатна маці справіла мне цэлы камплект — верхнюю сарочку, штаны ды торбачку-сумку для кніжак і сшыткаў. Я быў вельмі ўсцешаны!

Але ж радасць мая была нядоўгая. Першага верасня, яшчэ па дарозе ў школу, дзеці проста паднялі мяне на смех:

— Ну ты выстраіўся! Ну прыбраўся, — паказвалі яны пальцамі. — Паглядзіце на яго — белая варона!..

Быць ёй мне зусім не хацелася. А таму ў школу я проста не пайшоў. Пакуль дзеці вучыліся, прастаяў, прасядзеў у недалёкім бярэзніку, а потым разам з усімі вярнуўся дахаты. І там з плачам аб'явіў:

— Што хочаце са мною рабіце, але ў школу ў белай адзежы я ніколі не пайду!

Бацькі, як гэта ні дзіўна, не сталі ні ўгаворваць мяне, ні прымушаць.

— Можа, пафарбуем апраткі? — папытаўся тата ў матулі.

— Дык няма ж чым, — уздыхнула яна.

— Я пайду пашукаю, а ты нагрэй у катле ваду, — загадаў тата. А сам узяў сякеру і пайшоў да ракі.

Праз нейкі час ён вярнуўся дамоў з ахапкам альховых галінак і шышак. Укінуў іх у кацёл з вадой, туды ж адправіў мае абновы. Калі вада закіпела, некалькі разоў перамяшаў...

Ва ўсе вочы я глядзеў на гэта чараўніцтва: колер адзення рабіўся ўсё цямнейшы і цямнейшы. Факт, што з катла яго даставалі добра карычневым.

...Назаўтра ў школу я ішоў ужо з радасцю: ніхто з дзяцей з мяне не смяяўся, усе хутчэй зайздросцілі.

...Не памятаю, ці папрасіў я тады прабачэння ў сваіх бацькоў, а найперш — у матулі, бо гэта ж колькі яе працы было ўкладзена ў тыя абноўкі: вырасціць лён, убраць, паслаць, змяць, напрасці нітак, саткаць палатно, пашыць...

Зараз бы тое адзенне!

М. П. Багданаў,
в. Новы Пагост, Мёрскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж. ***Чытачы газеты прасілі расказаць пра аўтараў найлепшых «вясёлых і праўдзівых гісторый», пра пераможцаў конкурсу — 2017.***

Яно б і сапраўды: можна, бо «краіна павінна ведаць сваіх герояў»! Аднак з некім з іх мы знаёмы лепш, з некім, мякка кажучы, — горш... А таму спадзяёмся, што яны пра сябе раскажуць самі — у наступным выпуску рубрыкі.

■ Неасабісты суб'ектыў

ДЗЕНЬ АНЁЛА

Дарога такая ці той, хто ідзе, з яе збочыў?

Жаданне патэлефанаваць ёй у мяне цяпер з'яўляецца толькі аднойчы на год — у канцы студзеня, у Дзень яе анёла. Хочацца набраць даўно забыты (але ж дзесьці абавязкова запісаны!) нумар, нязмушана, нібы размаўлялі толькі ўчора, сказаць: «Прывітанне, імянінніца!» Пачуць у адказ штосьці жартаўлівае і гаварыць, гаварыць, як у дзяцінстве, аб усім — што бачыла, што чула, што прачытала, што адчуваеш...

Мы калісьці маглі гаварыць з ёй вось так гадзінамі, не заўважаючы, што ўжо ноч, што маці ўжо даўно патушыла ў нашым пакоі святло і строга загадала спаць. Мы тады проста пераходзілі на таямнічы шэпт, і ад гэтага было яшчэ больш хораша, і спаць зусім не хацелася... А калі прачыналіся — у акно спальні ўжо біла промнямі сонца, запрашаючы на вуліцу, дзе чакала столькі прыгод і ўражанняў. Хуценька паснедаўшы, мы імчалі туды, рабілі нейкую няцяжкую работу на падворку: палолі некалькі градак, рвалі свінням бліскучую ад расы макрыцу на мяжы, адносілі пойла цяляці на выган, збіралі па гнёздах курыныя яйкі. Потым садзіліся на веласіпед (ён у нас быў адзін на дваіх) — яна за рулём, я на багажніку, і імчалі за вёску, насустрач сонцу і ветру, дурнымі галасамі гарлаючы надта моднае тады «Две звезды, две светлых повести...»

Мы былі неразлучныя — «бы спрэжаныя», казала пра нас бабуля, — усе летнія канікулы, аж да дзясятага класа. Дзяцінства і зялёнае юнацтва, першае спасціганне самых важных у жыцці рэчаў — калі ўсведамляеш і пачынаеш адчуваць і ведаць, што такое каханне, подласць, сумленне, здрада, што можна, а чаго нельга — мы перажылі разам, у тыя шчаслівыя нашыя леты. Марылі: хутка я прыеду ў Мінск вучыцца, і мы будзем бачыцца нашмат часцей, хадзіць гуляць, дзяліцца праблемамі і таямніцамі, дапамагаць адна адной, падтрымліваць, калі ў тым будзе неабходнасць. Мы верылі, што так будзе ўсё жыццё, бо іначай проста і быць не магло.

Я пра гэта вельмі часта думаю, але так і не магу ўспомніць той кропкі, таго моманту ці выпадку, калі ўсё пачало ламацца. Не, гэта здарылася не тады, калі яна раптам, скончыўшы восьмы клас, не захацела вучыцца далей і пайшла ў вучэльню асвойваць вельмі перспектыўную спецыяльнасць зборшчыцы мікраэлектронікі — мы па-ранейшаму сябравалі, а калі я паступала ва ўніверсітэт, яна, адпрасіўшыся з «Інтэграла», дзе праходзіла практыку, чакала мяне ў дворыку БДУ пасля кожнага экзамену. І не тады, калі яна ў дзевятнаццаць выскачыла замуж за хлопца на пяць гадоў старэйшага, закаханага ў яе без памяці. Я была сведкай у іх на вяселлі і вельмі любіла прыязджаць да іх у госці: у іхняй кватэры заўжды было шумна і весела, збіралася вясёлая кампанія, былі жарты, музыка, віно. Можа, усё пачалося з тых самых кампаній? Але ў пачатку ўсёдазволеных дзевяностых большасць тых, каму было дваццаць-дваццаць пяць, жылі менавіта так — наводмаш, нарасхрыст, і гэта не перашкаджала вучыцца, працаваць, закладваць падмурак на дарослае сур'ёзнае жыццё...

А яна не змагла. Ці не захацела. І наўрад ці прычына ў мужы, які стаў надоўга пакідаць яе адну: уладкаваўся на «шабашку» ў Маскве, бо з работай тады было цяжка ўвогуле, а з работай грашовай, якая дазволіла б купляць маладой каханай жонцы ўсё, што яна хоча, — тым больш. Яна асабліва і не сумавала — кампаніі па-ранейшаму збіраліся ў іх гасцінным доме. Праўда, акрамя гэтых ужо штовечаровых пасядзелак, астатняе яе цікавіла надзвычай мала. Работу яна кінула — муж быў не супраць: маўляў, калі хочаш — сядзі дома, я грошы зараблю сам. Калі я згадвала пра яе колішнія планы паступіць у політэхнічны інстытут, толькі махала рукой: навошта? Дзяцей у іх не атрымлівалася, муж купіў ёй даражэннага пародзістага ката, каб не сумавала, пакуль яго няма. Не дапамагло — мужу вельмі хутка ў адной з вясёлых кампаній знайшлася замена. Ад таго, другога, хутка нарадзілася доўгачаканая дачка (яна вельмі хацела дзяцей). Нам яшчэ было пра што гаварыць, я памятаю, якім шчасцем свяціліся яе вочы, калі прыязджала да яе ў адведкі.

Можа, усё пайшло наперакос, таму што новы муж ужо тады быў калі не алкаголікам, дык запойным п'яніцам? А яна, ужо таксама прывыкшая да застолляў, не адмаўлялася, не адчуваючы, якую небяспеку нясе для яе самой чарговая распітая бутэлька. Мы ўжо амаль не сустракаліся: у вёску яна прыязджаць перастала, а ў госці да іх ехаць зусім не хацелася: застоллі там былі ўжо не падобныя на лёгкую маладзёжную вечарынку — цяжкія, цьмяныя, з мутнымі вачыма, з густым смуродам цыгарэтнага дыму і стойкага перагару. Дачцэ, такой любімай і чаканай, было гады чатыры, калі яе забралі на выхаванне бабуля ды цётка. Ад іх малая і ў школу пайшла. Бацькоў бачыла рэдка, але вельмі любіла, вельмі хацела ў іх застацца. Толькі бацькі не вельмі гэтага хацелі...

Бо ў іх ужо было сваё жыццё, па іхнім, загульна-п'яным сцэнарыі — з пастаяннай зменай месца работы, са скандаламі і бойкамі, з прымірэннем за той жа бутэлькай. Аднойчы яна пырнула сужэнца нажом, той трапіў у бальніцу, і справа магла б скончыцца калоніяй. Але муж пераканаў следства, што на нож з п'яных вачэй напароўся сам.

А потым у яе здарылася новая любоў. Яна развялася, зноў выйшла замуж. Новы муж быў ціхі п'яніца, але са сваёй неблагой жылплошчай і майстар на ўсе рукі. Таму праблемы зарабіць грошай не было, ездзілі разам улетку па ўсёй краіне, працавалі на будоўлі. Дачка тым часам вырасла, вывучылася, атрымала добрую запатрабаваную прафесію, жыве з бабуляй. З тым, як жыве маці, уся радня ўжо змірылася: уладкавалася ж усё-ткі, работу нейкую мае, мужа, а што выпівае — тут ужо нічога не паробіш...

За апошнія паўтара года яна стала ўдавой двойчы. Спачатку бацька дачкі палез у пятлю. А праз колькі часу сканаў ад інсульту, не дажыўшы да сарака сямі, яе апошні, надзея і апора. Яна засталася без работы і мае ўсе шанцы застацца без жылля (камуналку аплачвае дачка, але ж ці заўсёды так будзе). Ад якой-кольвек дапамогі ад свайго адмаўляецца, усе іх спробы пагаварыць аб тым, каб палячыцца, памяняць лад жыцця, разбіваюцца аб сцяну непрыняцця. Яна зноў «у пошуку». Чаго шукае? Здаецца, на гэта пытанне не адкажа нават яна сама.

Сёння ў яе імяніны. Увечары я, напэўна, усё-ткі збяруся і ёй пазваню. Нумар жа абавязкова дзесьці павінен быць запісаны...

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Фламінга. Арляня. Лідар. Каша. Шпрыц. Рвач. Абжора. Шчара. Расол. Вобла. Чарка. Пяць. Бістро. Бар. Голуб. Баба. Заасад. Га. Дырэктар. **Па вертыкалі:** Кабой. Бігудзі. Базар. Бланк. Брага. Дар.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.06	17.39	8.33
Віцебск —	9.01	17.23	8.22
Магілёў —	8.56	17.29	8.33
Гомель —	8.47	17.32	8.45
Гродна —	9.20	17.55	8.35
Брэст —	9.15	18.01	8.46

Месяц

Першая квадра
25 студзеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Елізара, Пятра, Якава.*
К. *Ванды, Палікарпа, Паўліны, Цімафея, Ціта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

26 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1805 год — нарадзіўся (в. Прусы, цяпер у Салігорскім раёне) Яўстафій Янушкевіч. Працаваў адвакатам, сакратаром камісіі па спадчыне Радзівілаў. Адзін з арганізатараў паўстання 1830—1831 гадоў на тэрыторыі Ашмянскага, Слуцкага і Навагрудскага паветаў. Пасля паражэння паўстання эмігрыраваў у Францыю, удзельнічаў у арганізацыі выдання твораў А. Міцкевіча, З. Красінскага, І. Лялявеля. Памёр у 1874 годзе.

1918 год — нарадзіўся (в. Нязнань Клімавіцкага раёна) Іван Рыгоравіч Новікаў, беларускі пісьменнік, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Дэбютаваў вершамі ў раённай газеце ў 1935 годзе. Прафесійную літаратурную працу пачаў з нарысаў. Першым значным творам была дакументальная аповесць «Сэрца інакш не можа» пра Веру Харужую. У 1959 годзе пачаў працаваць над кнігай «Руіны страляюць ва ўпор» — пра Мінскае падполле. Дакументальная аповесць вярнула з небыцця імёны герояў падполля, пяці з якіх пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, рэабілітаваны многія савецкія патрыёты. Далейшая распрацоўка гэтай тэмы знайшла працяг у дакументальных аповесцях «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску», «Да світання блізка», у гістарычных нарысах «Бяссмерце Мінска» і «Мінск — горад-герой». Выдаў нарысы «Палескае золата», «Побач сябры» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2001 годзе.

1938 год — нарадзіўся (в. Ходараўцы, цяпер у Лідскім раёне) Аляксандр Віктаравіч Шарапа, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі. Аўтар больш як ста навуковых публікацый, у тым ліку трох манаграфій, шэрагу навучальных дапаможнікаў.

У свеце

1878 год — падчас Руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў упершыню ў гісторыі была паспяхова ўжыта тарпедная зброя. Катары «Чэсма» і «Сіноп» тарпедамі патапілі на рэйдзе Батумі турэцкі ўзброены параход «Інтыбах».

1924 год — на другім з'ездзе Саветаў Петраград пастанавілі назваць Ленінградам у мэтах увекавечання памяці правадыра пралетарыяту, заснавальніка і першага кіраўніка Савецкай дзяржавы. Прапанова аб перайменаванні, падтрыманая рэзалюцыямі працоўных усіх фабрык і заводаў Петраграда, паступіла ад Петраградскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Гістарычная назва — Санкт-Пецярбург — вярнулася гораду ў 1991 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Казала ж мне ў дзяцінстве мама:

— Вова, цягні ноты! Не лянуйся!..

Я яе не паслухаўся. Цяпер цягаю піяніна.

Мы любім хадзіць у госці да Мішы і Наташы. У іх у доме заўсёды шмат настольных гульняў. З маіх любімых — партвейн.

— Ваш артыкул пра жанчыну, якая згубілася ў гарах і нічога не ела сорак дзён, выклікаў незвычайную цікавасць у чытачоў.

— Няўжо?

— Так, мы атрымалі ўжо каля сотні запытаў ад халастых шатландцаў, якія мараць ажаніцца з ёй.

Жанчына прыходзіць з мужам у ламбард:

— Мне трэба тысяча рублёў, вось мужыка ў вас як заклад пакіну.

— Грамадзянка, вы памыліліся адрасам! У нас тут каштоўнасці, золата.

— Пеця, адкрый рот!

Малюнак Аляксандра ШМІТА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 343. Нумар падпісаны ў 19.30 25 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 студзеня 2018 г. № 4 (437)

стар. 4

Хто ў выйгрышы ад КУПа?

стар. 13

Навошта патрэбны аглядныя камісіі?

стар. 16

Што «бачыць» відэакамера?

МЯСЦОВЫ ЧАС

АЦЭНЬВАЦЬ ПА СПРАВАХ

«МС» распачынае серыю публікацый пра вопыт мясцовага самакіравання ў рэгіёнах. Безумоўна, набыткі кожнай вобласці заслугоўваюць увагі і пераймання. Сёння мы прадстаўляем паўночны край — Віцебшчыну, дзе па выніках мінулага года адбыўся ўстойлівы рост у многіх сферах эканомікі. Безумоўна, свой уклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна ўнеслі і дэпутаты мясцовых Саветаў усіх узроўняў. Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ спецыяльна для гэтага выпуску даў інтэрв'ю нашаму выданню. Гэты і іншы артыкулы пра дэпутацкія справы Віцебшчыны — у сённяшнім нумары «МС».

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

На кіраўнічай пасадзе ён не навічок. Да таго як у красавіку 2016 года яго абралі старшынёй абласнога Савета дэпутатаў, займаў іншыя пасты ў выканаўчых органах улады. Быў намеснікам кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска, потым узначаліў аддзел культуры Віцебскага гарвыканкама, быў намеснікам віцебскага мэра. Працаваў і начальнікам упраўлення культуры аблвыканкама, потым — намеснікам губернатара Віцебшчыны па сацыяльных пытаннях. Работа з людзьмі яму знаёмая не па чутках. Уладзімір Уладзіміравіч добра ведае вобласць, яе асаблівасці і праблемы.

стар. 3

ЯК ЁСЦЬ

БУДНІ МАЛОГА ГОРАДА

Гарадскі пасёлак Івянец, які ўзнік на мяжы XIII—XIV стагоддзяў, знаходзіцца на ўскрайку Налібоцкай пушчы, у Валожынскім раёне. Лес здаўна карміў людзей ягадамі і грыбамі. Але яны спадзяваліся не толькі на дары прыроды. Тут жылі майстры, якія праславілі сваё паселішча вырабамі з дрэва, жалеза, гліны. Гандлёвыя сувязі садзейнічалі развіццю самых розных рамёстваў: ганчарнага, кавальскага, бондарскага, ткацкага, разьбы па дрэве. А мясцовыя муляры, тынкоўшчыкі, цесляры былі запатрабаваныя далёка за межамі мястэчка.

Набыткі сваіх продкаў здолелі зберагчы ў Івянцы і да нашых дзён. У пасёлку дзейнічае музей традыцыйнай культуры. Ён знаходзіцца ў будынку, узведзеным яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя. Ёсць і ўся неабходная сацыяльная інфраструктура для жыцця, вучобы і адпачынку. У Доме культуры амаль штодня ладзяцца разнастайныя конкурсы, выступленні, канцэрты, прэзентацыі і фестывалі. Дзіцячая школа мастацтваў — цэнтр эстэтычнага і музычнага выхавання падрастаючага пакалення, дзе займаецца каля 100 навучэнцаў.

Дарэчы, старшыню Івянецкага пасялковага Савета дэпутатаў Тэрэсу Ліпніцкую мясцовыя жыхары называюць мэрам горада. Тутэйшыя вельмі крыўдуюць, калі пра Івянец кажуць «аграгарадок»: «У нас горад, а аграгарадок — гэта суседні Ракаў».

Разам з тым Тэрэса Яўгенаўна не ўтойвае і праблем:

— Пасёлку ў першую чаргу не хапае дзіцячага садка. Яслі-сад «Лесавічок» месціцца ў прыстасаваным будынку пабудовы 1918 года. Калісьці тут былі казармы для польскіх салдат, затым — санаторый для дзяцей, хворых на сухоты, бальніца... Натуральна, памяшканне ў аварыйным стане. Мы спадзяваліся, што ў 2017 годзе пачнецца ўзвядзенне новай дзіцячай установы. Насупраць школы ўжо выдзелены зямельны ўчастак, праект прайшоў экспертызу. На жаль, нешта не атрымалася. А раённаму бюджэту такая ўстанова, вядома, не пад сілу. Дзіцячы сад наведвае 190 гадаванцаў. Цеснавата. Каб трохі разгрузіцца, летась арганізавалі падвоз малых у Сівіцкую школу, за шэсць кіламетраў ад Івянца.

стар. 23

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

ШТО Ў ПЛАНАХ?

У верхняй палаце — пасяджэнне Прэзідыума

Адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Міхаіла МЯСНІКОВІЧА.

На пасяджэнні разгледжаны вынікі дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ў 2017 годзе і задачы на перспектыву. Старшыня камісіі Аляксандр Папкоў праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб праводзімай у камісіі рабоце над законапраектамі, міжнароднай дзейнасці, узаемадзеянні з дзяржаўнымі органамі і органамі мясцовага самакіравання, а таксама асноўных кірунках дзейнасці ў гэтым годзе.

Разгледжаны таксама меры па рэалізацыі плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2018 год і ўдзел Савета Рэспублікі ў рэалізацыі Дэкрэта № 7. Асаблівая ўвага ўдзелена рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

ПА ЗАСЛУГАХ

За ўмацаванне сувязяў і супрацоўніцтва

Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, уручыла медаль «МПА СНД. 25 гадоў» першаму намесніку міністра замежных спраў Беларусі Андрэю Еўдачэнку.

Рашэнне аб узнагароджанні прыняў Савет Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у кастрычніку мінулага года — за заслугі ў справе развіцця і ўмацавання парламентарызму, уклад у развіццё і ўдасканаленне прававых асноў функцыянавання СНД, умацаванне міжнародных сувязяў і міжпарламенцкага супрацоўніцтва.

У цырымоніі ўзнагароджання прынялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў і прадстаўнік Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у МПА СНД — намеснік генеральнага сакратара Савета МПА СНД Віктар Кагут.

ЗРОБЛЕНА ШМАТ, АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

Кіраўнік Савета Рэспублікі сустрэўся з паслом Польшчы

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Польшчы ў Беларусі Конрадам Паўлікам, які завяршае дыпмісію ў краіне. На сустрэчы былі абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва, перспектывы ўмацавання гандлёва-эканамічных і міжпарламенцкіх сувязяў.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў асабісты ўклад пасла ў развіццё беларуска-польскіх адносін. «Істотна ўмацаваўся давер паміж нашымі краінамі, стала больш канструктывізму. Мы прасунуліся ў пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», — канстатаваў ён. У той жа час у краін ёсць добрая аснова для далейшага развіцця двухбаковых адносін, падкрэсліў спікер.

У прыватнасці, Беларусь і Польшча маглі б больш зрабіць у сферы прамысловай кааперацыі, пытаннях стварэння сумесных кампаній. «Нам трэба больш сумесных праектаў — інвестыцыйных, інавацыйных», — дадаў Міхаіл Мясніковіч. У якасці прыярытэтных сфер узаемадзеяння ён таксама назваў сельгасвытворчасць, рэгіянальнае супрацоўніцтва.

Асаблівая роля адводзіцца развіццю парламенцкага дыялогу. Старшыня Савета Рэспублікі нагадаў пра візіт у Беларусь у канцы 2016-га маршалка сената Польшчы Станіслава Карчэўскага. Падчас гэтага візіту быў дасягнуты шэраг канкрэтных дамоўленасцяў, якія цяпер рэалізуюцца.

«Канструктыўны зачын, пабудаваны на даверы і ўзаемнай павазе, усяляе ўпэўненасць у тым, што ў нас сапраўды добрыя перспектывы», — падсумаваў Міхаіл Мясніковіч.

Вераніка ПУСТАВІТ.

УЗАЕМАДЗЕЯННЕ

Будучыня — за сумеснымі прадпрыемствамі

БЕЛАРУСЬ зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Рэспублікай Карэя ў галіне прымянення новых тэхналогій агародніцтва адкрытага грунту, таксама стварэння сумеснага прадпрыемства па вытворчасці і перапрацоўцы лёну. Пра гэта заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ на сустрэчы з парламенцкай дэлегацыяй Рэспублікі Карэя.

Сустрэча беларускіх і карэйскіх парламентарыяў адбылася ў рамках візіту ў Мінск дэлегацыі Рэспублікі Карэя на чале з намеснікам старшыні камісіі Нацыянальнай асамблеі па наземнай інфраструктуры і транспарце, кіраўніком парламенцкай групы па супрацоўніцтве з Беларуссю Лі Вон Укам. У ёй таксама прынялі ўдзел члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргей Рахманаў і Ала Бодак.

На думку Аляксандра Папкова, аграрная галіна Беларусі можа стаць перспектыўным кірункам узаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

«Наша задача — развіццё экспарту, у тым ліку і сельскагаспадарчай прадукцыі, — падкрэсліў беларускі парламентарый. — У сувязі з гэтым аб'ектам для прыцягнення прамых карэйскіх інвестыцый у будучым могуць стаць сумесныя вытворчасці і сучасныя высокатэхналагічныя прадпрыемствы, напрыклад, па вытворчасці і перапрацоўцы лёну на тэрыторыі Беларусі». Асваенне выпуску новай прадукцыі з прыцягненнем найноўшых паўднёвакарэйскіх тэхналогій дасць штуршок да павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі і далейшага асваення замежных рынкаў.

Сёння асноўай беларускага экспарту ў Паўднёвую Карэю з'яўляюцца калійныя ўгнаенні, электронныя інтэгральныя мікрасхемы, шкловалакно. Станоўчую дынаміку мае попыт на лесаматэрыялы, мясныя кансервы і льняныя тканіны. Аднак, як падкрэслілі ўдзельнікі сустрэчы, тавараабарот паміж краінамі пакуль яшчэ не дастатковы. Улічваючы інтарэсы абедзвюх краін, у далейшым плануецца актыўна развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва. Таксама ёсць узаемнае імкненне да актывізацыі адносін на ўзроўні міжпарламенцкіх рабочых груп, створаных у Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Карэя.

У найбліжэйшы час трэба будзе распрацаваць дарожную карту па нарошчванні тавараабароту паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Карэя. Таксама будуць прапанаваны крокі па ўдасканаленні інвестыцыйнай палітыкі абедзвюх дзяржаў.

Наталля БІТЭЛЬ.

ВЫБАРЫ-2018

Закон ёсць закон

Змены ў працэсе фарміравання складу выбарчых камісій не плануюцца

У рэдакцыю нашай газеты паступіў ліст ад члена Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь Леаніда АНЦІПЕНКІ, у якім ён прапанаваў уласныя дапаўненні да працэдуры выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў.

«Выбары акажуцца больш празрыстымі і справядлівымі, калі ў выбарчыя камісіі — ад участковых і вышэй рангамі — будуць уключаны ў роўнай прапорцыі прадстаўнікі ад усіх кандыдатаў, — піша неабыякавы грамадзянін. — Гэтыя камісіі павінны ўзначальваць сустаршыні — таксама вылучэнцы ад кандыдатаў».

На думку Леаніда Анціпенкі, такім чынам падлік галасоў будзе адбывацца пад кантролем усіх зацікаўленых бакоў. Як прымяніць такую прапанову на практыцы? Напрыклад, калі па акрузе балатуюцца прадстаўнікі камуністычнай партыі, БНФ і лібералы, то ва ўчастковую выбарчую камісію ўключаецца па тры чалавекі ад кожнага кандыдата, а ўзначальваюць яе тры сустаршыні. Камісіі наш чытач прапануе фарміраваць пасля таго, як будуць зарэгістраваныя кандыдаты ў дэпутаты. Што адкажа на гэтую прапанову Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў?

Па словах **сакратара ЦВК Алены ДМУХАЙЛЫ,** працэдура фарміравання выбарчых камісій — у тым ліку ўчастковых — прапісана ў заканадаўстве, дзе выразна паказана, хто мае права вылучаць удзельнікаў у склад такіх утварэнняў. «Прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, прафсаюзаў, працоўных калектываў, а таксама самі грамадзяне-выбаршчыкі ў колькасці дзесяці чалавек могуць накіраваць прадстаўніка ў склад камісіі, — адзначыла яна. — На сённяшні дзень гэта ўрэгулявана заканадаўствам, таму так і будзе. Калі б зварот паступіў да нас, то мы б адказалі, што заканадаўствам прадугледжана іншая працэдура і ўсе ўдзельнікі выбарчага працэсу абавязаныя яе прытрымлівацца».

Што датычыцца ўключэння ў камісіі прадстаўнікоў ад кожнага кандыдата, то такія прапановы паступалі, расказала Алена Дмухайла. «Але ёсць некаторыя цяжкасці. Шмат пярэчанняў па гэтай прапанове, ёсць пытанні і па яе рэалізацыі», — дадала яна.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

АКТЫЎНАЯ ПАЗІЦЫЯ

СТАРТАВАЛА АКЦЫЯ «#МОЛАДЗЬ ВЫРАШАЕ!»

Яе ініцыятарам выступіла Мінская гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», а пасля ініцыятыву па збору прапаноў для будучых дэпутатаў мясцовых Саветаў падтрымалі рэгіёны.

Падчас акцыі саюза моладзі кожны ахвотны выбаршчык зможа напісаць свае пажаданні. Для гэтага, напрыклад, Мінскі гаркам БРСМ установіць у горадзе спецыяльныя скрыні. У наступным своеасаблівыя пажаданні гараджан будуць перададзены зноў выбраным дэпутатам. У сталіцы акцыя «#Моладзь вырашае!» будзе праходзіць штотыдзень (пятніца з 15.00 да 19.00, субота — нядзеля з 11.00 да 16.00) у папулярных для жыхароў Мінска месцах да 17 лютага.

Прадстаўнікі Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ уключаны ў склад выбарчых камісій усіх узроўняў. Найбольшая колькасць актывістаў саюза моладзі працуюць ва ўчастковых выбарчых камісіях — 615 прадстаўнікоў. Назіральнікі ад БРСМ акрэдытаваныя ва ўсіх тэрытарыяльных выбарчых камісіях і работа па акрэдытацыі ва ўчастковыя выбарчыя камісіі працягваецца. Акрамя таго, прадстаўнікі саюза моладзі Мінска актыўна змагаюцца за атрыманне дэпутацкіх мандатаў Мінгарсавета.

Тое ж датычыцца і рэгіёнаў. Цяпер не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй Беларусі кожны ахвотны выбаршчык зможа напісаць пажаданні патэнцыяльным дэпутатам, апусціўшы іх у спецыяльныя скрыні, установленыя ў месцах правядзення пікетаў БРСМ у падтрымку кандыдатаў у дэпутаты, а таксама ў час маладзёжных акцый, прысвечаных выбарам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АЦЭНЬВАЦЬ ПА СПРАВАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Уладзімір Уладзіміравіч, як бы вы ахарактарызавалі дэпутацкі корпус Віцебшчыны? Наколькі актыўныя тут дэпутаты, ці часта яны сустракаюцца з выбаршчыкамі?

— У нас дзейнічаюць 222 мясцовыя Саветы дэпутатаў. У тым ліку — абласны, 23 — базавага ўзроўню, 198 — першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню. У Саветы ўсіх узроўняў абрана 3192 дэпутаты.

Летась правялі больш за 1,8 тысячы сесій, разгледзелі каля 5,1 тысячы пытанняў. Народныя выбраннікі ажыццявілі больш за 29,3 тысячы асабістых прыёмаў, на якіх выслухалі каля 10,7 тысячы выбаршчыкаў. Акрамя гэтага праведзена больш за 12,3 тысячы сустрэч у акругах, зроблена 6420 справаздач перад выбаршчыкамі.

— Чым, на вашу думку, павінны займацца дэпутаты Саветаў на месцах? Вызначыце галоўныя кірункі іх работы.

— Дэпутацкі корпус працуе поруч, ці, як мы кажам, у адзінай звязцы з выканаўчай вертыкаллю ўлады. Гэта вельмі важны момант. Бо менавіта мясцовая ўлада — самая блізкая да чалавека. І яна павінна быць максімальна адкрытай, а яе дзейнасць — празрыстай.

Галоўная мэта работы Саветаў дэпутатаў — спрыяць у рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, рашэнні праблемных пытанняў, павышэнні дабрабыту і якасці жыцця людзей. Ад правільных падыходаў і ўважлівага стаўлення да кожнага чалавека залежыць ступень даверу і падтрымкі насельніцтва.

Для таго каб ажыццяўляць свае задачы, Саветы павінны аператыўна і дзейсна рэагаваць як на цяжкасці, якія ўзнікаюць, так і на надзённыя патрэбы сваіх выбаршчыкаў.

— Ці цалкам выкарыстоўваецца сёння дэпутацкі патэнцыял вобласці? Якія «рэзервы» можна яшчэ задзейнічаць? Ці ўдалося пазбавіцца ў гэтай рабоце ад фармалізму?

— У цэлым дэпутаты ўсіх узроўняў праводзяць работу па вырашэнні актуальных праблем і патрэб людзей. Аднак сапраўды не паўсюдна для дэпутатаў сельскіх Саветаў стала нормай зацікаўленае стаўленне да работы з насельніцтвам па месцы жыхарства. А яны, як ніхто іншы, у першую чаргу павінны быць памочнікамі ўлады пры вырашэнні мясцовых пытанняў.

Значная частка дэпутатаў — кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый. На жаль, бывае так, што прадпрыемства не выконвае заданне па росту эканамічных паказчыкаў, а між тым кіраўнік-дэпутат сам галасаваў за гэтае заданне. Нельга, каб слова разыходзілася са справай. Таму быць дэпутатам — гэта адказнасць і перад сваім калектывам, і перад выбаршчыкамі.

Да дзейнасці ў выбарчай акрузе неабходна падыходзіць не фармальна. Адпаведна, у склад Саветаў павінны ўваходзіць людзі неабыякавыя, бескарыслівыя, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія не лічацца са сваім асабістым часам. Дэпутат абавязаны ў любы момант адгукнуцца на патрэбы і праблемы выбаршчыкаў.

— Вы з'яўляецеся членам Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Наколькі запатрабаваная гэта структура? Для чаго яна існуе і якія мэты перад сабой ставіць?

— Гэты Савет — калегіяльны і дарадчы. Займаецца распрацоўкай прапаноў па ўдасканаленні дзейнасці органаў мясцовага самакіравання. І паралельна — каардынацыяй пытанняў узаемадзеяння паміж імі і органамі дзяржаўнага кіравання.

Члены Савета знаёмяцца з напрацоўкамі ўлады рэгіёнаў у вырашэнні розных пытанняў. У кожнай вобласці ёсць чаму павучыцца. Іх станоўчы вопыт выкарыстоўваецца на Віцебшчыне, як і наш — у іншых абласцях.

— «МС» ужо не аднойчы пісала пра дзейнасць старэйшын. Прыдзвінскі край быў, так бы мовіць, першапраходцам у фінансавым заахвочванні гэтых «мэраў» вёсак. Калі ласка, падзяліцеся меркаваннямі пра іх дзейнасць.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Уладзімір Цярэнцьеў з ветэранам, мастаком Аляксандрам САЛАЎЁВЫМ.

— Старэйшыны населеных пунктаў, можна сказаць, актыўныя пасярэднікі паміж насельніцтвам і прадстаўнічай, выканаўчай уладай. Аказваюць досыць адчувальную дапамогу сельсавету ў своечасовым вырашэнні праблем, якія патрабуюць неабходнага ўмяшання з боку мясцовай улады, з'яўляюцца членамі саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку, назіральных камісій.

> Нельга дапусціць, каб гэтыя вёскі зніклі. Ёсць шмат спосабаў іх захавання. Напрыклад, праз развіццё аграэкатурызму, фермерства.

Напрыклад, старэйшына вёскі Новыя Валосавічы Лепельскага раёна Іван Блажко выступіў з ініцыятывай па аднаўленні капліцы ў вёсцы Красналучка. І ў рамках міжнароднага праекта на гэта было выдзелена 1200 еўра.

Плённа працуе старэйшына вёскі Княжыцы Валынецкага сельсавета Верхнядзвінскага раёна Валянціна Аўсянкіна. Штогод праводзіць свята вёскі, Масленіцу, «Калядныя сустрэчы», «Вясковыя вячоркі». Па яе ініцыятыве пры ўездзе ў вёску ўсталяваны і асвечаны крыж. А ў сетцы «Аднакласнікі» створана група «Княжицы.by». Туды ўступаюць як жыхары вёскі, так і нашчадкі людзей, якія раней жылі там. Вялікая работа праведзена па зборы звестак аб гісторыі гэтага населенага пункта, у вёскі нават ёсць свой гімн!

Малады старэйшына вёскі Баруны Плюскага сельсавета Уладзімір Адахоўскі на ўласным трактары вывозіць смецце і расчышчае дарогі. Ён таксама дапамагае састарэлым і нямоглым аднавяскоўцам...

І такіх прыкладаў можна прыводзіць шмат. Старэйшыны праводзяць актыўную работу па зборы добраахвотных узносаў. Сродкі ад «самаабкладання» накіроўваюцца на добраўпарадкаванне вуліц, могілак, зрэзку аварыйных дрэў...

Найбольш актыўныя старэйшыны раз у квартал атрымліваюць матэрыяльнае заахвочванне. Летась на «прэміраванне» было выдаткавана больш за 100,1 тысячы рублёў.

— Адна з асаблівасцяў Віцебшчыны — самая вялікая колькасць населеных пунктаў. Безумоўна, гэты факт не можа не адбівацца на дзейнасці райсаветаў, сельсаветаў?

— Так, у нас 6260 населеных пунктаў. І каля 44 % — з колькасцю насельніцтва да 10 чалавек. Дапамога жыхарам маланаселеных пунктаў — на асаблівым кантролі. Для паляпшэння транспартнага абслугоўвання абнаўляецца аўтобусны парк. Ва ўсіх вёсках аказваецца гандлёвае і бытавое абслугоўванне. Функцыянуюць 150 комплексных прыёмных пунктаў. Даступныя і паслугі паштовай сувязі. Дарэчы, з 400 паштовых аддзяленняў 283 — у сельскай мясцовасці.

У маленькія вёсачкі прыязджаюць самадзейныя артысты, «чытальні на колах». Нельга дапусціць, каб гэтыя вёскі зніклі. Ёсць шмат спосабаў іх захавання. Напрыклад, праз развіццё аграэкатурызму, фермерства. Нагадаю, Прэзідэнт не раз заклікаў бізнесменаў, ураджэнцаў такіх мясцін, аказваць ім падтрымку, ствараць там прадпрыемствы і турыстычныя аб'екты.

— Віцебск у апошнія некалькі гадоў папрыгажэў. Аднаўляюцца храмы, устанаўліваюцца помнікі. Вы асабіста, працуючы ў розных органах улады, шмат зрабілі, каб горад стаў больш прывабны для турыстаў і зручны для пражывання гараджан. На ваш погляд, чаго яшчэ не хапае на сёння абласному цэнтру? Што плануецца пабудаваць у найбліжэйшы час?

— Так, зроблена многае. І радуе, што з кожным годам мы бачым усё больш турыстаў. Яны падарожнічаюць па розных экскурсійных маршрутах: «Віцебск — горад Марка Шагала», «Па старонках гісторыі 1000-гадовага Віцебска», «Віцебскі рэнесанс»... Па Заходняй Дзвіне ў навігацыйны час курсіруюць два цеплаходы.

Летась да Дня горада ўсталявалі скульптуры «Стары Хатабыч» і «Рыбка», унікальную арт-лаўку «Сядзейка». Завяршылі рэканструкцыю двух помнікаў архітэктуры, у адным з якіх — музей Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, створанага Шагалам. А ў другім — на вуліцы Сяроднебярэжнай — загс Чыгуначнага раёна Віцебска.

> У шэрагу выпадкаў, рэагуючы на асобныя дробязныя пытанні, мы патураем утрыманству, нежаданню грамадзян самім вырашаць свае праблемы.

Распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя для будаўніцтва палаца ганаровых абрадаў, спецыялізаванай залы для скачкоў на батуце. Шукаюцца інвестары для ўзвядзення «Аквапарка»... Сёлета ў мікрараёне «Білева-2» плануецца здаць яслі-садок на 200 месцаў.

— А можаце, Уладзімір Уладзіміравіч, прыгадаць не зусім стандартныя пытанні, якія агучвалі выбаршчыкі?

— На прамую лінію мне патэлефанаваў жыхар Аршанскага раёна. Расказаў аб нібыта дрэннай якасці тэлесігналу. Пасля выезду на месца брыгады РУП «Белтэлекам» высветлілася, што заяўнік выкарыстоўвае самаробную прыёмную антэну. І яна не забяспечвае неабходную якасць сігналу. Яму была прадэманстраваная работа тэлевізара з дэцыметровай антэнай, пасля чаго прэтэнзіі былі зняты...

Увогуле, калі аналізаваць практыку работы з людзьмі, многія звароты, просьбы да ўлады абгрунтаваныя. Але ў шэрагу выпадкаў, рэагуючы на асобныя дробязныя пытанні, мы патураем утрыманству, нежаданню грамадзян самім вырашаць свае праблемы. А ёсць і такія, хто ва ўльтыматыўнай форме выказвае прэтэнзіі з нагоды таго, што за іх павінны зрабіць — неадкладна і бясплатна. У падобных сітуацыях я і мае калегі тлумачым, што павінна ў рамках закона рабіць улада, а што — грамадзяне самастойна. У прыватнасці, яны павінны прымаць актыўны ўдзел у навядзенні парадку на сваім двары, вуліцы, у населеным пункце.

— Што, на вашу думку, патрэбна для ўмацавання аўтарытэту дэпутатаў мясцовых Саветаў?

— Каб дэпутату давяралі выбаршчыкі, яму трэба быць добра інфармаваным аб тым, што адбываецца ў акрузе. Дэпутат абавязаны ведаць, чым жывуць выбаршчыкі, якая сітуацыя на прадпрыемствах і ў арганізацыях. Толькі так ён можа эфектыўна інфармаваць адказных асоб аб праблемах, чаканнях людзей, каб разам спрыяць вырашэнню пытанняў.

Дэпутат не толькі словам, а, перш за ўсё, справай можа заслужыць давер сваіх выбаршчыкаў. Адпаведна — аўтарытэт. Людзі павінны бачыць клопат з боку органаў улады на месцах і ў першую чаргу — Саветаў дэпутатаў, народнай улады.

Гутарыў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

(Працяг тэмы на 4, 13–14 стар.)

СКЛАД ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ НА СТУДЗЕНЬ 2018 ГОДА

Усяго дэпутатаў — 55.
Грамадзяне ва ўзросце да 30 гадоў — 0.
Грамадзяне Расійскай Федэрацыі — 1.
Жанчыны — 11.
Больш за 1 скліканне — 34.
Члены палітычных партый (КПБ) — 2.
Кіраўнікі арганізацый — 37.
Намеснікі кіраўнікоў арганізацый — 8.
Кіраўнікі структурных падраздзяленняў — 6.
Работнікі адукацыі, культуры, навукі, аховы здароўя — 17.
Работнікі гандлю, бытавога абслугоўвання — 1.
Работнікі дзяржаўных органаў — 10.
Работнікі прамысловасці, транспарту, будаўніцтва — 14.
Работнікі сельскай гаспадаркі — 4.
Іншыя — 9.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:

«У Віцебскай вобласці ёсць станоўчая дынаміка ў параўнанні з мінулым. Назіраецца прырост валавога рэгіянальнага прадукту на 1,3 %, таксама прыраслі прамысловасць, сельская гаспадарка. Але Прэзідэнт усхваляваны тым, што не зусім добрыя фінансавыя, эканамічныя паказчыкі. Рэнтабельнасць прадукцыі ніжэйшая, чым у сярэднім па рэспубліцы: па Віцебскай вобласці гэта толькі 5 %, сярэдняя па рэспубліцы — каля 9 %. Вялікая колькасць стратных гаспадарак, прадпрыемстваў — 21 %, у той час як па рэспубліцы — 16 %.

Таму кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што трэба сур'ёзна папрацаваць па павышэнні эфектыўнасці, зніжэнні сабекошту прадукцыі. Мяркую, гэта задача для органаў улады Віцебскай вобласці».

Вераніка ПУСТАВІТ.

ПА ВОПЫТ

ХТО Ў ВЫЙГРЫШЫ?

Для чаго існуюць вясковыя КУПы і каму ад гэтага добра? Адказ на пытанне мы знайшлі на Лепельшчыне.

НЕ так даўно пра камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы ў Віцебскай вобласці можна было сказаць так: многа хто чуў, мала хто бачыў. Аднак апошнім часам некаторыя сельсаветы вырашылі, што мець уласны КУП — добрая ідэя. Што датычыцца Лепельскага раёна, то там падобная форма гаспадарання захоўваецца без малога 13 гадоў — ад самага заснавання і да сёння.

Жыццё прымусіла

У аграгарадку Камень механізаванае звяно з'явілася яшчэ ў 2000-х гадах. Гэткі правобраз КУПа, арганізаваны па ініцыятыве тагачаснага старшыні абласнога Савета дэпутатаў, на той момант быў адзіным разумным выйсцем. Сельгаспрадпрыемствы перажывалі не самыя лепшыя часы і ледзь спраўляліся з уборкай ураджаю на ўласных палетках. На ўчастку вяскоўцаў камбайны прыходзілі толькі позняй восенню, калі збожжам паспявалі падкарміцца мышы, а калоссе прэла ад дажджоў. Зразумела, што ў такой сітуацыі жыхары мусілі спраўляцца сваімі сіламі ды адсылаць абураныя скаргі ў сельвыканкам.

— Напачатку задачай мехзвяна была апрацоўка агародаў у прыдатныя для гэтага тэрміны, — расказвае **старшыня Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Мікалай СІНІЦЫН.** — Потым змянілася заканадаўства, і наша арганізацыя ператварылася ў КУП «Каменьаграсэрвіс». Мэты і задачы засталіся ранейшыя, змяніўся толькі арганізацыйны падыход.

Дастаўка паліва, будаўнічых матэрыялаў, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, вываз смецця, навядзенне парадку на могілках, знос састарэлых будынкаў — спіс паслуг, якія тэарэтычна можа выконваць КУП, можна працягваць. Сёння на прадпрыемстве ў Камені пастаянна працуюць 15 чалавек — з іх дзевяць малаказборшчыкаў. Летам, калі пачынаецца гарачая пара, да іх далучаюцца яшчэ 3-4 працаўнікі па дагаворы падраду. За год комплекс паслуг у грашовым эквіваленце ацэньваецца прыкладна ў 3 тысячы рублёў, пры гэтым магчымасцяў хапае на дапамогу Лепельскаму і Баброўскаму сельсаветам. Дарэчы, калі гарадская арганізацыя прывязе вяскоўцу на падворак прычэп дроваў з разліку 7,5 рубля за кіламетр, то КУП выканае тую ж работу за 5,5 рубля.

> Безумоўна, КУП — не панацэя ад усіх праблем, але мы і не разлічваем на прыбытак. Наша задача — зменшыць сацыяльнае напружанне.

Як кажа **старшыня Лепельскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай МІСЮРА**, арганізоўваць КУПы мясцовыя ўлады прымусіла само жыццё.

— Калі пачаліся перамены на вёсцы, «Віцебскхлебпрам» стаў інвестарам для калгаса «Пражэктар». У гаспадаркі з'явіліся новыя магчымасці, адпаведна — новыя клопаты, таму ад апрацоўкі вясковых агародаў яна адмовілася. І мы вымушаны былі на базе Слабадскога сельсавета стварацьКУП. Калгас перадаў туды трактар, апрацоўчую тэхніку і паўнамоцтвы на аказанне паслуг мясцовым жыхарам. Аналагічная сітуацыя адбылася ў Стайскім, Горскім, Валосавіцкім сельсаветах... Так што арганізацыя прадпрыемстваў па прыкладзе Каменя не была нейкім эксперыментам ці жаданнем вылучыцца, — мы проста адрэагавалі на сітуацыю, якая складвалася ў раёне. Цяпер з пяці КУПаў засталося чатыры. Адбылося гэта з-за аб'яднання двух прадпрыемстваў у адно, таму што попыт на паслугі паменшыўся.

Міхаіл ТЫЧЫНА працуе ў КУП Каменскага сельсавета ад самага яго заснавання.

Міхаіл АНОШКА *(злева)* і Валерый САДОЎСКІ аглядаюць тэхніку. Сёлета на гэтым трактары Міхаіл будзе расчышчаць вясковыя вуліцы ад снегу.

Грошы з малака

Сапраўды, сёння таго валу работы, які існаваў першыя гады, няма. Некаторыя сельскія гаспадаркі падняліся на ногі, з'явіліся індывідуальныя прадпрымальнікі, гатовыя аказваць паслугі. Акрамя таго, і самі жыхары ўсё часцей апрацоўваюць зямлю не конікам або наёмным трактарам, а ўласным мотаблокам.

Ёсць і іншая прычына таго, што колькасць зваротаў у КУП паменшылася: гэта старэнне насельніцтва. Працэс хоць і сумны, аднак цалкам лагічны. Моладзь шукае выгод у гарадах, старыя, прывязаныя да зямлі, паміраюць. Дачнікі прыязджаюць толькі на лета і з большай ахвотай займаюцца маленькім агародчыкам, чым гадуюць жывёлу і сеюць збожжа. Адпаведна, камунальным прадпрыемствам трэба прыстасоўвацца да ўмоў.

Напрыклад, зімою з работамі спраўляецца механізатар на адным трактары. Для многіх работнікаў праца арганізавана на палову стаўкі. Людзі занятыя па спецыяльнасці і адначасова падпрацоўваюць у КУПе. Так, Міхаіла Тычыну можна лічыць у нейкім сэнсе «старажылам»: мужчына дапамагае каменскаму прадпрыемству з самага яго заснавання, пры гэтым працуе школьным вартаўніком. У «несезон» падпрацоўка прыносіць каля 200 рублёў, што на вёсцы можна лічыць адчувальнай прыбаўкай да асноўнага заробку.

> У выступленні на пленарным пасяджэнні IV Усебеларускага народнага сходу Мікалай Місюра расказваў пра вопыт Лепельскага раёна ў аказанні сельскагаспадарчых паслуг насельніцтву. Закрануў старшыня і праблемныя тэмы, напрыклад, маральна і фізічна састарэлую тэхніку, на якой даводзіцца працаваць. КУПы заснаваны на прынцыпах самафінансавання, у цяперашніх умовах іх даходы з цяжкасцю пакрываюць расходы, і вольных грашовых сродкаў няма.

— Няхай КУП бярэ на сябе абавязак па расчыстцы вуліц ад снегу, абкосе абочын, зборы малака — па ўсіх тых мерапрыемствах, на якія грошы і так выдаюцца з раённага бюджэту. У асноўным па раёнах сельгаспрадпрыемствы адмовіліся ад закупкі малака ў жыхароў, і гэта функцыя аддадзена прыватнаму бізнесу. Але чаму грошы за сабранае малако не зарабіць КУПам — тым больш што гэту паслугу яны могуць выконваць якасна? — разважае Мікалай Місюра.

> Выратаванне сітуацыі ў цэлым лепельскі старшыня бачыць у фінансавай дапамозе, якая не пашкодзіла б прадпрыемствам для ўмацавання матэрыяльнай базы і, па магчымасці, ва ўсталяванні роўных правоў з сельгаспрадпрыемствамі.

Напрыклад, пакуль што няма адтэрміноўкі плацяжу на год пры закупцы гаруча-змазачных матэрыялаў. КУПы тэарэтычна не маюць зямлі і не вырабляюць сельгаспрадукцыю. Аднак на практыцы іх тэхніка апрацоўвае агароды, на якіх людзі гэтую сельгаспрадукцыю вырошчваюць.

> Арганізацыя прадпрыемстваў па прыкладзе Каменя не была нейкім эксперыментам ці жаданнем вылучыцца, — мы проста адрэагавалі на сітуацыю, якая складвалася ў раёне.

Эфектыўны паказчык

Здавалася б, навошта арганізоўваць КУП, калі з ім з'яўляецца столькі праблем? Як аказалася, часам станоўчыя змены пераважаюць над нязручнасцямі.

> Ёсць і іншая прычына таго, што колькасць зваротаў у КУП паменшылася: гэта старэнне насельніцтва. Працэс хоць і сумны, аднак цалкам лагічны.

— Даводзілася чуць ад калег, што стварэнне камунальных прадпрыемстваў — гэта складана і нікому не патрэбна, — прызнаецца Мікалай Місюра. — Не бяруся разважаць у агульным, у кожнай мясцовасці — свае ўмовы. З уласнага вопыту магу сказаць, што пасля 13 гадоў працы адмаўляцца ад КУПаў ні Камень, ні іншыя сельсаветы не будуць. Яны зручныя для мясцовай улады, бо палягчаюць нашу работу. Старшыня выканкама адчувае сябе гаспадаром, які не залежыць ад старонняй асобы. Не трэба ісці да дырэктара калгаса і прасіць вывезці смецце ці шукаць леснікоў, каб прыбраць паваленае буранам дрэва. Безумоўна, КУП — не панацэя ад усіх праблем, але мы і не разлічваем на прыбытак. Наша задача — зменшыць сацыяльнае напружанне.

Пасля моцнага снегападу дарожныя службы ў першую чаргу расчышчаюць галоўныя дарогі. У вёску тэхніка дабіраецца праз некалькі дзён. За гэты час, па выразе **старшыні Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Валерыя САДОЎСКАГА**, тэлефон паспяваў нагрэцца ад званкоў са скаргамі. Аднак цяпер перыферыйныя вуліцы расчышчае Слабадскі КУП — хутка і гэтак жа бясплатна для жыхароў, як і дарожнікі. Сёлета старшыня плануе набыць трактарную касілку, каб апрацоўваць абочыны летам. Вясна традыцыйна пачынаецца з вывазу смецця з могілак, восенню запатрабавана бульбакапалка. Як бачна, некаторыя запыты застаюцца нязменнымі і праз гады, а да новых можна прыстасавацца.

— Мы рады, калі зваротаў у сельсавет становіцца менш, — падсумоўвае Валерый Садоўскі. — Няважна, хто аказвае паслугі: КУП, прыватнік ці яшчэ якая арганізацыя. Тут галоўнае, каб работа выконвалася хутка, якасна і на прымальных для вяскоўца ўмовах.

Гэта якраз і будзе паказчыкам эфектыўнасці працы мясцовых улад.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ТВОРЧЫЯ ТЭЛЕВІЗІЙНЫЯ ПАРТРЭТЫ

сучасных беларускіх мастакоў зняў Алег Лукашэвіч

Вядомыя журналісты Алег ЛУКАШЭВІЧ і Аляксандр АЛЯКСЕЕЎ падрыхтавалі аўтарскі тэлевізійны цыкл «Сучаснае мастацтва Беларусі», прысвечаны адметным беларускім мастакам XXI стагоддзя. Прэм'ерны паказ праекта пачаўся на тэлеканале «Беларусь 3», а аўтарская прэзентацыя — у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

10 фільмаў цыкла — гэта 10 творчых партрэтаў нашых сучаснікаў. Сярод іх — лаўрэат дзяржаўнай прэміі Беларусі Валерый Шкаруба, лаўрэаты спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва Канстанцін Касцючэнка і Ігар Бархаткоў, а таксама народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў, які ў лютым гэтага года адзначыць сваё 95-годдзе. Дарэчы, адным з першых фільм пра Леаніда Дзмітрыевіча паглядзеў заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Барыс Крэпак. Ён высока ацаніў як падбор палотнаў жывапісца, так і аператарскую работу, якая прадэманстравала не толькі яркія фрагменты карцін Шчамялёва, але і з цеплынёй паказала майстэрню самога аўтара.

Таксама праект пазнаёміць гледача з унікальным стылем віцябляніна Алега Крошкіна, гродзенкі Валянціны Шобы і мінчаніна Сяргея Рымашэўскага. Аўтарам фільма ўдалося зняць унікальныя кадры з народным мастаком Беларусі Анатолем Бараноўскім і заслужаным дзеячам мастацтваў Уладзімірам Кожухам, якія летась пайшлі з жыцця. Зараз гэтыя відэахронікі набываюць новую каштоўнасць — як дакументальнае сведчанне, якое ўвайшло ў гісторыю.

З ЧАГО ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ

Партнёрам праекта «Сучаснае мастацтва Беларусі» выступіў «Пріорбанк». І такое супрацоўніцтва склалася не без падстаў. Банк на працягу дзесяцігоддзяў фарміруе адну з найбуйнейшых у краіне карпаратыўных калекцый твораў сучаснага мастацтва Беларусі. **Старшыня праўлення «Пріорбанка» Сяргей КАСЦЮЧЭНКА** расказаў, з чаго пачынаўся тэлепраект:

— У 2016 годзе да нас звярнуліся аўтары фільма і прапанавалі паўдзельнічаць у яго падрыхтоўцы. Мы далі прынцыповую згоду, паколькі цікавімся жывапісам, — кажа Сяргей Касцючэнка. — У нашай калекцыі больш за тысячу работ сучасных майстроў, якія мы набывалі з моманту заснавання — на працягу трыццаці гадоў. Яе канцэпцыя — сучасныя беларускія мастакі, якія пішуць алеем. На жаль, некаторых аўтараў ужо няма ў жывых, а карціны іх засталіся. Таму мы пагадзіліся, але прапанавалі, каб выбар дзесяці герояў праекта заставаўся за намі. Што датычыць аўтараў фільма, то гэта прафесіяналы, работы якіх камерцыйна паспяховыя, — тое, што яны робяць, высокага ўзроўню і добра прадаецца. Мне пашчасціла працаваць з людзьмі, якія валодаюць высокім мастацкім густам і майстэрствам. Таму і фільмы атрымаліся добрыя.

Асобная серыя праекта прысвечана аднаўленню храма ў гонар святых Касмы і Даміяна ў аграгарадку Вішнева Валожынскага раёна, на малой радзіме Сяргея Касцючэнкі. Фрэскавым роспісам сцен і мазаікамі для іканастаса займаўся малады калектыў з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — Глеб Отчык, Паліна Амельяновіч і Канстанцін Касцючэнка.

— Аднойчы айцец Аляксандр запрасіў мяне ў Вішнева, — працягвае Сяргей Касцючэнка. — Я нарадзіўся ў тых мясцінах. Мой бацька працаваў дырэктарам мясцовай школы, маці — настаўніцай. Нягледзячы на тое, што жылі мы там не доўга, усяго тры гады, гэта мая радзіма. Паглядзеўшы, у якім стане храм, я пагадзіўся дапамагчы. Але прапанаваў сваё бачанне рэстаўрацыі. Я цікавіўся дзейнасцю рускага іканапісца Дзіянісія, які жыў і працаваў у XVI стагоддзі. Адны з самых знакамітых яго работ — роспісы сцен і іканастаса Ферапонтава манастыра, якія ён выканаў разам з двума сынамі. За 30 дзён мастакі распісалі 600 квадратных метраў! Як узор мы разглядалі і Міражскі манастыр у Пскове.

Сёння магу прызнацца, што працэс роспісу праходзіў няпроста. Існавалі сумненні, у тым ліку і ў айца Аляксандра. На пэўным этапе прыйшлося нават спыніць работы. Але мастацтвазнаўцы высока ацанілі зробленае, і мы вырашылі працягваць. Спадзяюся, што не толькі аднавілі гісторыка-культурны аб'ект і напоўнілі яго мастацкім зместам, але стварылі цікавае і камфортнае для турыстаў месца.

У студзені аўтарскі калектыў за працу над афармленнем храма быў узнагароджаны прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Грашовую прэмію, дарэчы, якую атрымаюць мастакі, паводле слоў Глеба Отчыка, вырашылі раздзяліць з прыхаджанамі храма, якія падтрымлівалі іх падчас аднаўленчых работ.

Падчас прэзентацыі праекта.

ФІЛЬМЫ ЎХВАЛІЛІ САМІ ГЕРОІ

Паказаць мастака шматгранна — як асобу, як творцу, данесці да гледача яго светапогляд і філасофію — такую няпростую задачу паставілі перад сабой аўтары праекта. Як працавалася над фільмамі, мы спыталі ў яго **аўтара і рэжысёра Алега ЛУКАШЭВІЧА.**

— Калі мы толькі пачыналі, вырашылі паглядзець, што зроблена пра мастакоў да нас. Як аказалася, творчых партрэтаў, якія паўнавартасна б прадстаўлялі асобу, амаль няма.

Нават пра Леаніда Шчамялёва, які хутка адсвяткуе 95-годдзе, знайшлі толькі 13-хвілінны фільм, дзе не было інтэрв'ю з ім. Нашай задачай было не толькі зняць фільм, але і супрацоўнічаць з мастакамі. Пасля таго як фільмы былі закончаны, мы паказалі іх самім героям.

— Якія, дарэчы, засталіся ў іх уражанні?

— Мы вельмі задаволеныя, што фільмы ўхвалілі самі мастакі і іх блізкія. Для нас гэта важна. Бо мы імкнуліся паказаць не толькі творчую біяграфію жывапісцаў, але і прадэманстравалі іх творы. І тут важна было зрабіць гэта правільна, без скажэнняў, каб глядач мог пабачыць не фрагмент, а твор цалкам.

— Ці лёгка працавалася над праектам? Усё ж ініцыятыва па выбары яго герояў сыходзіла ад «Пріорбанка».

— Для першага цыкла былі абраны разнапланавыя героі. Кожны з іх — яркая старонка сучаснага мастацтва. У іх свой почырк, і ён пазнавальны. Таму нам было проста з героямі, якія ўпусцілі нашу здымачную групу ў свой свет, даверыліся нам. У выніку пра кожнага атрымаўся творчы тэлевізійны партрэт. А нашы партнёры па праекце далі нам поўную свабоду ў стварэнні фільмаў.

«Мы не проста фіксуем, як майстар працуе каля мальберта, мы транслюем яго светапогляд, успрыняцце жыцця і філасофію».

— Якія зрабілі для сябе адкрыцці падчас работы над праектам? Хто з яго герояў вас уразіў?

— Кожны мастак цікавы сваёй біяграфіяй, а галоўнае — тымі работамі, якія ён стварае. Нас уразіла жыццялюбства Леаніда Шчамялёва. Нягледзячы на шаноўны ўзрост, ён памятае ўсё да самых дробных дэталяў. Яго работы захапляюць чысцінёй, зззяннем колеру. Валерый Шкаруба перадае настрой, характэрны для беларускага пейзажу, — няспешная плынь часу, якая зачароўвае сваёй бясконцасцю. Дынастыя Бархатковых — гэта чатыры мастакі, не падобныя адзін да аднаго сваёй манерай жывапісу, чым і цікавыя. Кожны з нашых герояў дастойны таго, каб пра яго ведала новае пакаленне, якое, магчыма, першы раз пойдзе ў музей.

— Ці ёсць планы працягнуць гэты праект?

— Так, нам хацелася б, каб ён і надалей быў падтрыманы. Ёсць цэлая плеяда адметных майстроў, і кожны з іх дастойны асобнага фільма. На жаль, многія з іх ужо ў сталым узросце, і сёння мы не маем пра іх нават хранікальных кадраў. Таму каштоўнасць праекта — у яго дакументальнасці. Мы не проста фіксуем, як майстар працуе каля мальберта, мы транслюем яго светапогляд, успрыняцце жыцця і філасофію. Таму гэты матэрыял з цягам часу будзе ўсё больш унікальны.

ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ

Адзін з герояў праекта, Валерый Шкаруба, прызнаўся, што наведвальнікі яго выставы, якая зараз праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, цяпер заўсёды глядзяць фільм.

— Я шчаслівы, што трапіў у дзясятку майстроў, дастойных на думку стваральнікаў, стаць героем такога тэлепраекта. Амаль месяц на маёй выставе круціцца фільм, і ні адзін наведвальнік не праходзіць міма — глядзіць ад пачатку да канца. Гэта вельмі ўдалая работа на высокім мастацкім узроўні. Размова ідзе пра складаныя рэчы ў мастацтве, але простай, зразумелай для кожнага мовай.

Старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА высока ацаніў праект, адзначыўшы, што ў выніку работа атрымалася духоўная і эмацыянальна кранальная.

— Я шчыра радуюся, што ёсць людзі, якія дбаюць пра сваю малую радзіму. Дзесяцігоддзямі мы руйнавалі храмы. І шмат нашых каштоўнасцяў, як вядома, знаходзяцца па розных музеях свету. А зараз час збіраць камяні, і мы за 25 гадоў незалежнасці здзейснілі істотныя рухі ў гэтым напрамку. І такі тэлепраект — гэта велізарны крок для замацавання нашай духоўнасці.

Тэлепраект «Сучаснае мастацтва Беларусі» можна пабачыць на тэлеканале «Беларусь 3» па буднях у 19.30.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

«ДВАЙНАЯ СУЦЭЛЬНАЯ»
«Беларусь 1», з 29 студзеня

Трапіць у заблытаную сітуацыю часам даволі проста, а вось знайсці з яе выйсце — задачка не для ўсіх. Гераіня гэтай 16-серыйнай меладрамы Ганна згубілася ва ўласных пачуццях і жаданнях, а ў выніку апынулася замужам... за двума рознымі мужчынамі і разрываецца паміж імі.

Ганна працуе маркетолагам у парфумернай кампаніі і выкарыстоўвае свае частыя камандзіроўкі для пераездаў з адной сям'і ў другую. У яе родным горадзе жанчыну чакаюць двое дзяцей і спакойны, нешматслоўны муж Валодзя, а ў другім — драйв, рамантыка і маладзейшы за яе забяспечаны прыгажун Аляксандр...

«ЗОРКІ ПАД ГІПНОЗАМ»
АНТ, з 4 лютага

Новае забаўляльнае шоу, якое анонсы прадстаўляюць як «самае інтрыгуючае», — расійскі аналаг французскага праекта Stars sous hypnose, у якім папулярныя асобы са сферы шоу-бізнесу, тэлебачання, спорту добраахвотна пагаджаюцца на гіпнатычны сеанс перад камерамі, дэманструюць незвычайныя здольнасці і кардынальныя змены паводзін, а таксама праходзяць забаўныя іспыты.

Вядучым праекта стаў Максім Галкін, які не ўпусціў выпадку пакпіць: «У маёй практыцы гэта першае шоу, дзе гледачы, якія заснулі, — прыкмета поспеху!» «Праграмаваць» публічных асоб і гледачоў з залы будзе гіпнолаг Іса Багіраў. Напрыклад, актрыса Галіна Данілава пад гіпнозам пераўвасобілася ў трэнера зборнай Расіі па футболе, спявак Аркадзь Укупнік часова пазбавіўся голасу, а наш зямляк Дзмітрый Калдун... Зрэшты, глядзіце і ўсё ўбачыце.

«ХТО Ў ДОМЕ ГАСПАДАР?»
НТБ-Беларусь, па нядзелях

Многія людзі заводзяць дамашніх улюбёнцаў, аднак далёка не ўсе лёгка знаходзяць паразуменне з вусатымі і хвастатымі. Чаму так здараецца і як можна выправіць сітуацыю, гледачам дапамогуць разабрацца прафесіяналы — зоапсіхолагі: кінолаг Віталь Арлоў, фелінолаг Аляксандра Аляксандрава і ветэрынар, спецыяліст па экзатычных жывёлах Максім Шчугараў. Праект, як адзначаюць яго стваральнікі, насамрэч не пра жывёл, а пра людзей — як правіла, менавіта з-за чалавечых памылак і пралікаў пачынаюцца праблемы ў стасунках з нашымі меншымі братамі.

У першых выпусках праграмы «Хто ў доме гаспадар?» спецыялісты дадуць карысныя парады па выхаванні звышактыўнага і няўклюднага коціка, перамогуць ляноту і залішнюю вагу сабакі, адшукаюць прычыну нелюбові папугая да гаспадыні і падкажуць, як правільна ўтрымліваць каракала ў хатніх умовах...

Панядзелак, 29 студзеня

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 23.55 «Зона Х». (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Двайная суцэльная». (16+).
12.35, 14.30, 15.25 Меладрама «Мой найлепшы вораг». (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.50 Нашы. (6+).
22.05 Серыял «След». (16+).
23.35 Арэна.
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 Тэлераніца. (12+).
9.00, 19.05, 20.50 Тэлебарометр.
9.30 Капейка ў капейку. (12+).
10.05 «Калі мы дома». Скетчкам. (16+).
10.35 Камень, нажніцы, папера. (16+).
11.10 «Свет навыварат». (16+).
12.00 «Ікона стылю». (16+).
12.55 «Спатканне з будучыняй». (16+).
13.50 М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
15.00 Анімацыйны фільм «Ральф». (12+).
16.40 Камедыя «Від зверху найлепшы». (16+).
18.05 «Зразумець. Дараваць». Драма. (16+).
19.15 Суперлато.
20.00 «Спатканне з будучыняй». (16+).
21.25 Два рублі. (12+).
21.45, 22.05 «ЛавЛавCar». (16+).
22.00 КЕНО.
22.45 Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
23.15 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме». (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Капытцы.
8.05, 12.00, 19.55 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 12.15 «Гэты дзень».
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Наперад у мінулае».
9.50 «Вытокі. Эпімах-Шыпіла». Дак. фільм (12+).
10.15 «Міравы хлопец». Маст. фільм (12+).
11.35 «Навукаманія» (6+).
12.20 «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
12.50 «Беларусь як песня». Валянціна Пархоменка.
13.15 «Славянскі базар у Віцебску — 1996».
14.10 «Я хачу гэта ўбачыць!» Навагрудак (6+).
14.35, 22.15 «Зброя Першай сусветнай вайны». «Жніво смерці» (12+).
15.15, 21.05 «Вяртанне рэзідэнта». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).
16.30 «Паляванне на апошняга жураўля». Маст. фільм (12+).
18.15 «Не выпускай з-пад увагі». Маст. фільм (12+).
20.10 «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Пан Тадэвуш».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Вялікія мастакі». Жорж Сёра (12+).

Беларусь 5

8.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Супермікс.
9.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Змешаная эстафета.
10.25 Пра спорт. Вынікі тыдня.
11.05 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Фінал.
12.45 Гульні «навыраст».
13.15, 16.00 Спорт-мікс.
13.25 Трэніровачны дзень.
13.55 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Слован» (Браціслава).
16.10 Дзюдо. Чэмпіянат Беларусі.
18.15 Піт-стоп.
18.45, 21.35 Спорт-цэнтр.
19.25 Легенды спорту. Беларускія гісторыі.
19.25 Баскетбол. 3х3. Міжнародны турнір. Palova Snowball.
21.45 Змешаныя адзінаборствы. UFC.

АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Контуры».
10.00 «Жыць здорава!» (12+).
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.20, 13.10 «Генii і ліхадзеі» (12+).
13.55 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.55 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
16.20 «Адваротны адлік». «Космас Чурлёніса. Беларускія матывы» (12+).
16.55 «На самай справе» (16+).
18.20 «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
19.05 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 «Наша жыццё».
22.20 «Спартклуб» (12+).
22.50 Серыял «Налёт» (16+).
0.45 «Начныя навіны».

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Вялікае снеданне» (12+).
10.00 «Тыдзень спорту».
10.40 Фантастыка «Трансформеры-3: цёмны бок Месяца» (12+).
13.10 «Вадзіць па-руску» (16+).
13.50 «Іншая краіна». «Ісландыя. Краіна разумнікаў і тупікаў».
14.55 «Праца навыварат» (16+).
15.55 «Вялікі горад».
16.50 «Тэледоктар» (12+).
17.35 «Далёкія сваякі» (16+).
17.55 «Прапаршчык Шматко, або Ё-маё!» Серыял (16+).
21.10 Фільм-спектакль «Утаймаванне свавольнай». 1973 год (16+).
0.00 «Яловая субмарына». 2005 год (16+).
1.00 Маст. фільм «Амерыканская трагедыя». 4-я частка (16+).
4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).

EuroSport 1

3.25, 9.25 Алімпійскія гульні. Sports explainers.
3.30 Алімпійскія гульні. «Алімпійскі дух».
3.45, 7.00 Снукер. German Masters.
5.00, 8.30, 11.00, 18.30, 1.40 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
6.00, 9.30, 17.00, 2.30 Веласпорт. «Кам'юнідад Валенсіяна».
10.25, 1.30 Алімпійскія гульні. «Алімпійскае прызнанне».
10.30, 20.30, 1.00 Зімовыя віды спорту. «Пункт назначэння».
14.00, 19.30 Горныя лыжы. Кубак свету.
16.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
21.00 Снукер. German Masters. Фінал.
2.25 Алімпійскія гульні. «Ones to watch».

Кінакамедыя

0.35 Камедыя «Мільён для чайнікаў». (16+).
2.35 Шоу «Камедыянты». (16+).
3.05 Камедыя «Кур'ер». (16+).
4.55 Камедыя «Бамбу». (16+).
6.45 Камедыя «Гэты няёмкі момант». (16+).
8.40 Камедыя «Гігантык». (16+).
10.30 Камедыя «Ноч у Парыжы». (16+).
12.20 Камедыя «Вялікае вясельле». (16+).
14.00 Камедыя «Сяброўства і нікага сексу?» (16+).
15.45 Камедыя «21 і больш». (16+).
17.30 Камедыя «Доля анёлаў». (12+).
19.30 Камедыя «Усё пра мужчын». (16+).
20.55 Камедыя «Неадэкватныя людзі». (16+).
23.00 Камедыя «Кахае не кахае». (16+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
10.00 «Паненка і кулінар» (12+).
10.35, 1.15 «13». Серыял (16+).
14.20 «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
15.35 «Паляванне на ведзьмаў». Дак. фільм (16+).
16.25 «Палавінкі немагчымага». Серыял (12+).
19.40 «Без падману» (16+).
20.30 «Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана». Драма (12+).
23.20 «Асцярожна, махляры!» (16+).
23.50 «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял.
4.40 «Імя. Зашыфраваны лёс» (12+).

ТБ1000

6.10, 15.30 Там, дзе сэрца. (16+).
8.35 Яшчэ адна з роду Балейн. (16+).
11.05 Пабочны эфект. (16+).
13.15 Неверагодны Халк. (16+).
17.50 У пагоні за шчасцем. (12+).
20.10 Аферысты Дзік і Джэйн. (16+).
22.00 Воўк. (16+).
0.25 Удачы, Чак! (18+).
2.20 Крысціна. (16+).
4.10 Баец. (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Размова (16+).
7.50 Уцёкі (16+).
10.15 Клушы (16+).
12.25 Белы Бім Чорнае вуха. 2-я серыя (6+).
14.15 Канікулы строгага рэжыму (12+).
16.30 Няўлоўныя (16+).
18.20 Гетэры маёра Сакалова. 7—8-я серыі (16+).
20.20 Чыстае мастацтва (16+).
22.10 Паляванне на Піранню (16+).
0.40 Зоймемся любоўю (16+).
2.20 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
3.55 Слухач (12+).
5.30 Свята Нептуна (12+).

National Geographic

6.00 Узлом Сістэмы. (16+).
7.05, 13.20 Займальная навука. (12+).
7.55 Кітайская мегаграбніца (12+).
9.25 Мегамасты. (12+).
10.10 Цуды інжынерыі. (12+).
11.50 Праз мільён гадоў. (12+).
12.35 Дзікае надвор'е. (12+).
14.10 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
14.55 Фатальны пажар на «Тытаніку». (12+).
15.40 Ледзяная дарога. (12+).
16.25 Шаша праз пекла. (12+).
17.15 Аўта-SOS. (12+).
18.00, 22.00, 1.10 Гісторыя пра нас. (16+).
18.50 Расійскія сакрэтныя матэрыялы. (16+).
19.35 Карставыя варонкі: пахаваныя жывымі. (16+).
20.25 Лініі Наска: расшыфравана. (12+).
21.10 Зона 51: сакрэтныя файлы ЦРУ. (16+).
22.45, 2.50 Дзіўная Другая сусветная. (16+).
23.35 Прарыў. (16+).
0.20 Ліхтугі за мяжой. (18+).
2.00 Паранармальнае. (16+).
3.35 Расследаванні авіякатастроф. (16+).
5.15 Космас: прастора і час. (12+).

Discovery

8.00 З любасці да машын.
11.00, 7.10 Што магло пайсці не так?
12.00 Касмічныя НЗ.
13.00 Залатая ліхаманка.
14.00 Ліквідатар.
17.00 Хуткія і гучныя.
18.00 Гаражны рамонт.
19.00 На краі Аляскі.
20.00, 2.00 Махінатары.
23.00 Аляска: апошні рубеж.
0.00 Хлопцы з Юкана.
1.00 Іржавая імперыя.
2.55 Металаломшчыкі.
3.50 Каралі грузавікоў.
4.40, 6.45 Як гэта ўстроена?

У праграме магчымы змяненні.
Перадрукоўка праграмы забаронена.

НА ВЫЕЗД!

НЕ КАБІНЕТНАЯ РАБОТА,

або Групай у рэйд, каб наведаць, праверыць, папярэдзіць, дапамагчы!

У Лёзненскім раёне назіральным камісіям дапамагаюць рэйдавыя групы, якія выязджаюць туды, дзе неабходны дадатковыя ўвага і кантроль. Дарэчы, члены камісій ёсць і ў складзе груп. Сістэма адпрацавана і апраўдвае сябе. Новы падыход дае добры вынік.
Вопыт Лёзненшчыны вывучыў наш карэспандэнт у складзе адной з такіх груп. Журналіст амаль увесь працоўны дзень суправаджаў тых, хто выязджаў у вёскі, у тым ліку і аддаленыя.

Ад ратавальніка да дэпутата

У 2012 годзе мабільныя рэйдавыя групы былі створаны па рашэнні старшыні райвыканкама. У іх склад увайшлі работнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, РАУС, тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва, аддзелаў адукацыі, аховы здароўя райвыканкама і г. д. Словам, тыя, хто мае паўнамоцтвы на месцах прымаць неабходныя рашэнні, калі трэба — радыкальныя.

— Канешне, і назіральныя камісіі па-ранейшаму эфектыўныя. Але іх члены, напрыклад, старэйшыны, паштальёны, настаўнікі, іншыя актывісты, не маюць такіх паўнамоцтваў, як члены рэйдавых груп «ад райвыканкама». У апошніх, можна і так сказаць, больш высокі «статус», больш рычагоў уздзеяння. Праца ў звязцы дае аптымальны вынік, — канстатуе **начальнік Лёзненскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, дэпутат райсавета Віталь ЧАЙКІН.**

Напрыклад, ратавальнікі не толькі папярэджваюць аб небяспецы. Калі, напрыклад, у доме старых людзей у дрэнным стане печ, калі не працуе апавяшчальнік, могуць напісаць ліст дзецям, сваякам, каб праявілі клопат. Уносяцца прапановы аб разглядзе нядбайнага домаўладальніка на савеце грамадскага пункта аховы правапарадку. Удакладняюцца пытанні аказання дапамогі на рамонт печаў і праводак па лініі ведамства сацыяльнай абароны і сельвыканкамаў.

Міліцыянеры займаюцца прафілактыкай з тымі, хто злоўжывае спіртным і скандаліць. Работнікі сацыяльнай службы вызначаюць, ці не трэба старых падчас зімовых халадоў перавесці на «сацыяльныя ложкі» — у спецыяльныя ўстановы, пад апеку дзяржавы. І, доўга не зацягваючы, прымаюць рашэнні. Дэпутаты, прадстаўнікі ЖКГ, газавай службы, энерганагляду і г. д. падчас рэйдаў таксама «адпрацоўваюць» свае задачы.

Самі рэйды праводзяцца сістэматычна, у прыватнасці, зімой, — каб папярэдзіць пажары, каб усе жыхары былі забяспечаны дровамі.

Вясной людзей папросяць адрамантаваць агароджы, прывесці падворак у парадак. Пацікавяцца, якая падтрымка неабходна ў вядзенні падсобных гаспадарак. Ратавальнікі правядуць гутаркі аб выкананні патрабаванняў бяспекі, нагадаюць, што грамадзянам трэба прыбраць сухую расліннасць і смецце, што нельга выпальваць траву паблізу ад пабудоў, каб прадухіліць узгаранні.

Удзельнікі рэйду могуць «адпрацоўваць» як асобна ўзяты населены пункт, так і некалькі.

Гарадскім жыхарам, напэўна, цяжка зразумець, чаму ў глыбінцы праводзяцца такія мерапрыемствы: «каманда напрошваецца ў госці». Каб праверыць, ці ўсё нармальна, папярэдзіць, дапамагчы. Напэўна, у гарадах многія не ведаюць прозвішча ўчастковага. Наўрад ці адразу ўспомняць сваіх дэпутатаў гарадскога і абласнога Саветаў. На перыферыі ўсё па-іншаму. Тут мясцовыя народныя выбраннікі самі прыязджаюць у госці да выбаршчыкаў.

Лепшыя інфарматары

У рэйдзе мы былі разам са згаданым вышэй Віталем Чайкіным, а таксама з **загадчыцай аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Святланай ДАЎГАПОЛАВАЙ і старшым участковым інспектарам міліцыі Лёзненскага РАУС Настассяй МАСЛОЎСКАЙ.**

Рэйдавыя групы, калі выехалі не ў адну вёску, а ў некалькі, — працуюць «кропкава», бо ёсць канкрэтная інфармацыя, куды і навошта трэба ехаць. Напрыклад, наведаць сям'ю залежных ад алкаголю, а на суседняй вуліцы — адзінока пражываючага. А недалёка жывуць шматдзетныя бацькі: ці ўсё зроблена, каб дома ў іх было цёпла, ці спраўныя печ, электраправодка?

У добрым папярэднім інфармаванні членаў рэйдавай групы аўтар гэтых радкоў упэўніўся ў Дабрамыслянскім сельсавеце. **Старшыня сельскага Савета Сяргей ПЕТУШКОЎ** перадаў членам групы спіс грамадзян, якіх трэба наведаць абавязкова. Пры гэтым расказаў пра кожнага. Дапамагала інфармаваць і кіраўнік справамі... Як заўважыў Віталь Чайкін, так зладжана працуюць у кожным сельвыканкаме.

Па ўказаных адрасах мы і паехалі.

Старэйшына вёскі Выхадцы Галіна Сцяпанаўна ЛАГВЯНКОВА таксама ведае ўсё пра ўсіх. У населеным пункце 44 чалавекі. Тых, кім могуць зацікавіцца падчас рэйду, папярэдне наведала і праверыла, што ды як. І так робіць часта.

— Добра працуе старэйшына! Вельмі энергічная, адданая справе, якой займаецца. А, між іншым, ёй ужо 75 гадоў, — адзначыў Віталь Чайкін.

«Самі батарэйку памяняйце!»

Многіх з грамадзян, якіх наведалі, нармальнаму чалавеку не зразумець.

Напрыклад, мясцовы жыхар, калі ратавальнік папрасіў яго замяніць батарэйку, каб праверыць работу апавяшчальніка, прапанаваў маёру... самому гэта зрабіць. Той не разгубіўся і параіў гаспадару навучыцца такому простаму дзеянню. Бо яго жыццё ў першую чаргу ў яго руках. Дарэчы, батарэйку можна купіць нават не выходзячы з дома — у паштальёнаў, якія абавязкова іх маюць пры сабе.

Калі, канешне, чалавек сам не можа справіцца, яму абавязкова дапамогуць, каб апавяшчальнік працаваў заўсёды.

У іншым населеным пункце муж і жонка маглі б стаць героямі карыкатур на тэму прафілактыцы п'янства. Жанчыну на наступны дзень пасля рэйду адправілі ў аддзяленне кругласутачнага знаходжання — дзеля яе бяспекі.

Яшчэ аднаго грамадзяніна, адзінага жыхара вёскі Бандоры, дома не засталі. Але не размінуліся, бо ён ішоў нам насустрач па дарозе. Як растлумачылі мае спадарожнікі, ён так часам гуляе: да суседняй вёскі і назад, каб у кампаніі выпіць. У гэты дзень таксама быў навесяле. З ім правялі прафілактычную размову наконт таго, што «пад градусам» у мароз хадзіць небяспечна.

Цяжка было гутарыць і з не зусім цвярозымі састарэлай жанчынай і яе сынам-інвалідам...

Сярод іншых наведалі вёсачку Сяло — на мяжы з Расіяй. Аматара спіртнога, пра якога паведамілі ў сельвыканкаме, не было дома. На наступны дзень да яго зноў завітаюць члены групы і дачакаюцца...

Выратаванне жыццяў

Пасля рэйду — а паралельна з намі працавала яшчэ адна група — у сельвыканкаме падводзілі вынікі.

Выслухоўвалі ўдзельнікаў **старшыня раённага Савета дэпутатаў Тамара ДРЫЛЁНАК, начальнік РАУС Канстанцін КНЯЗЕЎ, начальнік РАНС Віталь ЧАЙКІН.** Афармляліся пратаколы даручэнняў. У іх запісана, якім адказным асобам і што канкрэтна трэба зрабіць, якія прыняць меры рэагавання і ў які тэрмін. Пратаколы прадстаўляюцца старшыні райвыканкама. Кантралюецца ход выканання рашэнняў. Як і тое, што было зроблена падчас мінулых рэйдаў.

Дарэчы, былі выпадкі, калі візіты такіх груп літаральна выратоўвалі жыцці. Напрыклад, бабуля магла задыхнуцца, бо сама ж рана закрыла дымаход у печы. А ў доме праблемнай сям'і непагашаны недакурак мог стаць прычынай пажару...

Галоўная задача рэйдаў — не дапусціць бяды. І якім бы ні быў чалавек: дастойным, законапаслухмяным або асацыяльных паводзін — пра яго трэба клапаціцца. І рабіць усё магчымае, каб не загінуў, не знік без вестак.

Групы будуць выязджаць і надалей. Каб перавыхоўваць, прапаноўваць працу, выратоўваць дзяцей ад гора-бацькоў, аказваць дапамогу адзінокім і адзінока пражываючым... Дарэчы, беларускі вопыт актыўна выкарыстоўваецца і ў Расіі. Пра гэта не раз гаварылі прадстаўнікі органаў аховы правапарадку краіны-суседкі, якія наведвалі Віцебшчыну і Лёзненскі раён у прыватнасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БІЗНЕС-АСЯРОДДЗЕ

«У МЯНЕ ПРАЦУЮЦЬ ТРЫ ЧАЛАВЕКІ, але я наняў бы шэсць!»

Што адбываецца з малым прадпрымальніцтвам удалечыні ад сталіцы?

ДЗЯКУЮЧЫ з'яўленню дробных гульцоў на бізнес-рынку ў дзяржаве з'яўляецца канкурэнцыя, пашыраецца сфера паслуг, а айчынная эканоміка становіцца больш стабільнай. Аднак рэальнасць такая, што сёння ў Беларусі рызыкаваць і ўкладаць усе грошы ва ўласную справу мала хто гатовы, асабліва ў аддаленых рэгіёнах. Наш карэспандэнт адправіўся ў Браслаўскі раён, каб абмеркаваць праблемы і перспектывы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а таксама адшукаць прыклад паспяховага бізнесу на адлегласці больш чым за 250 кіламетраў ад Мінска.

Пазіцыя ўлады

Старшыня Браслаўскага раённага Савета дэпутатаў Ніна ПУЧЫНСКАЯ сцвярджае, што сёння ў раёне ствараюцца спрыяльныя ўмовы для развіцця дробнага і сярэдняга прадпрымальніцтва. «Пра гэта сведчаць і лічбы: у нас па стане на першага студзеня зарэгістраваны 464 суб'екты гаспадарання малога і сярэдняга бізнесу, — адзначыла дэпутат. — З іх 97 — юрыдычных, што для сельскага раёна досыць шмат. Як ствараюцца ўмовы? Аддзелы эканомікі аказваюць кансультацыйную, арганізацыйную і метадычную дапамогу, прадастаўляюць пляцоўкі і дзяржаўную маёмасць, якая не выкарыстоўваецца. Так, летась было выдзелена шэсць зямельных участкаў».

Што датычыцца характару малога і сярэдняга прадпрымальніцтва раёна, то каля 40 % — гэта гандаль, нямала бізнес-праектаў у будаўніцтве, транспартнай сферы, фермерскай гаспадарцы і рэкламнай дзейнасці.

«Адно з праблемных пытанняў у гэтым кірунку — не заўсёды ёсць праваўстанаўлівальныя дакументы на дзяржаўную маёмасць, — расказала Ніна Пучынская. — Так, ёсць графік па ўключэнні ў гаспадарчы абарот такой маёмасці, і ён зацверджаны старшынёй раённага выканаўчага камітэта, але не заўсёды ёсць належная колькасць фінансаў, таму складана зрабіць гэта хутка».

> Я разумею: укладзеныя грошы не вернуцца ні заўтра, ні нават паслязаўтра. Пытаннене ў тым, каб укласці і «адбіць» іх праз тры гады. Пытанне ў тым, каб атрымліваць стабільны даход».

Адсюль і праблема: патэнцыйнаму інвестару можа спадабацца закінуты хутар або крама на ўскраіне вёскі, але без дакументаў ні пра які продаж гаворкі быць не можа. Старшыня Браслаўскага раённага Савета дэпутатаў падкрэсліла, што гэты аспект актыўна прапрацоўваецца. «З работай службаў пытанняў няма, праблема толькі ў фінансах, і яна паэтапна вырашаецца».

На думку Ніны Пучынскай, сёння дзяржава ідзе насустрач тым, хто хоча адкрыць сваю справу, і ніякіх бар'ераў у заканадаўстве для гэтага няма. «Напрыклад, змены ў заканадаўчай базе, якія спрыяюць развіццю рамесніцтва. У нас 124 рамеснікі ў раёне, а нованаўвядзенні дазволілі ім прадаваць свае работы самастойна, на аснове грамадзянска-прававых дагавораў з юрыдычнымі асобамі і прадпрымальнікамі. Яны нават маюць права навучаць іншых асоб сваёй дзейнасці. Гэта дазволіла пашырыць і спектр паслуг, — падкрэсліла дэпутат. — Таму і расце колькасць людзей, якія жадаюць гэтым займацца».

Вядома, у пэўнай ступені поспех Браслаўскага раёна — гэта прыродныя рэсурсы і сур'ёзны турыстычны патэнцыял, згаджаецца Ніна Пучынская. Несумненна, гэта дае штуршок для развіцця бізнесу. «Так, у міжсезонне запаўняльнасць баз адпачынку складае 40 %, тады як улетку гэты паказчык дасягае 100 %, — дадае яна. — Але скажыце, каму не перашкаджае сезоннасць?»

Ламаць — не будаваць

«Калі я пачула, што хочуць зрабіць на гэтым месцы, не паверыла, што такое магчыма, — кажа старшыня Мяжанскага сельвыканкама Жанна АКУЛА па дарозе ў кафэ «Струсцянскі прытулак». — Вядома, я спадзявалася на лепшае, але планы былі занадта ўжо грандыёзныя».

Кафэ знаходзіцца ў вёсцы Струста (адсюль і назва), каля трасы Браслаў—гара Маяк. Гэта зараз яно выглядае прывабна, тэрыторыя акультурана, але яшчэ шэсць гадоў таму тут стаяў стары дом, які пакасіўся ад узросту, а зямля ўся была ў зарасніку.

Як часта бывае, усё вырашыў энтузіязм аднаго чалавека: **Аляксандр ШАКЕЛЬ** убачыў у гэтым месцы патэнцыял,таму з году ў год робіць яго ўсё больш камфортным для сваіх гасцей. «Дарэчы, сцены я пакінуў тыя ж, памянялі толькі дах. Па сутнасці, дом здабыў новае жыццё, — адзначае Аляксандр. — Як з'явілася ідэя? Я займаюся аграТурызмам ужо 12 гадоў, ёсць і сядзіба, але я звярнуў увагу на адсутнасць паслуг. А якая ў першую чаргу патрэбна паслуга, калі вы прыязджаеце на адпачынак? Правільна, паесці хатняе».

Што датычыцца грашовых укладанняў, якія забяспечылі паступовае аднаўленне дома, то ўсе сродкі — гэта асабістыя зберажэнні ўладальніка. «Вядома, крэдытныя рэсурсы і раней, і сёння выдаюцца пад занадта вялікі працэнт. Калі казаць пра субсідаванне, то яно ў нас адсутнічае, — дадае Аляксандр. — Але не забывайце, што ў мяне на ўсё пайшло шэсць гадоў: нешта зарабляў, прадаў аграсядзібу — грошы пайшлі сюды. Я разумею: укладзеныя грошы не вернуцца ні заўтра, ні нават паслязаўтра. Пытанне не ў тым, каб укласці і «адбіць» іх праз тры гады. Пытанне ў тым, каб атрымліваць стабільны даход».

Таксама прадпрымальнік лічыць, што сёння ўмовы для паспяховай рэалізацыі бізнес-ідэй створаны, аднак іх неабходна дапаўняць і пашыраць. «Што гэта азначае? Напрыклад, спрошчанае падаткаабкладанне. Ёсць такое словазлучэнне — раздзельны ўлік. Я летам захацеў прапанаваць гасцям пяць веласіпедаў, а гэта ўжо атрымліваецца пракат, або іншы від дзейнасці. Раздзельны ўлік у такім выпадку як афармляецца? — пытаецца бізнесмен. — Форму, якую нам даў Прэзідэнт, неабходна напоўніць. І гэта адбудзецца — проста патрэбны час. З тым жа велапракатам — я ж павінен усё ведаць наперад, таму што займаюся бізнесам і думаю аб стратэгіі развіцця. І тут вырашае кожная дробязь, якую лепш растлумачыць у заканадаўстве. Праблема ў выразнасці тлумачэнняў».

> Сёння ў Аляксандра працуюць тры чалавекі — усе мясцовыя, аднак больш ён узяць не можа, паколькі зарэгістраваны як індывідуальны прадпрымальнік. «Я гатовы браць шэсць! — падкрэслівае ён. — Ахвотныя ёсць, але я — не магу. У мяне ўзнікае пытанне: чаму? Мне здаецца, трэба даць гэтыя паўнамоцтвы мясцовай уладзе. Калі бачна, што бізнесмен працуе сумленна, то чаму б асобна не разгледзець пытанне аб тым, каб дазволіць яму ўзяць яшчэ трох чалавек?»

На пытанне аб тым, чаму індывідуальны прадпрымальнік не ператворыцца ў ААТ, ён адказвае, што не справіцца з дакументаабаротам і іншымі фактарамі.

Бізнес Аляксандра Шакеля пацвярджае тэзіс аб тым, што сёння ўстановам неабходная разнапланавасць, асабліва ў рэгіёнах. Так, у кафэ ёсць більярд і аэрахакей, а на тэрыторыі прадпрымальнік паставіў маленькую лазню-бочку на чатырох чалавек і мангал, зрабіў дзіцячую пляцоўку. У планах — дарабіць пляцоўку для караванераў: вывесці на паркоўку электрычнасць і ваду. Галоўнае — не стаяць на месцы, паколькі што без пастаяннага развіцця бізнес доўга не працягне.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

УКАЗ № 100

КАБ БЫЎ ПАРАДАК...

На Шуміліншчыне, пачынаючы з 2012-га, калі быў падпісаны Указ № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці», і да канца мінулага года ў грамадзян прынялі 136 апавяшчэнняў аб намеры выкарыстоўваць дамы. Гаспадары прывялі ў парадак 121 пустуючы дом. Знесена 219 старых будынкаў.

ПАВОДЛЕ распараджэння старшыні райвыканкама ў адпаведнасці з патрабаваннямі ўказа дзейнічае камісія па абследаванні стану такога жылля ў сельскай мясцовасці. Яе работа сістэмная: яна плануецца, рэгулярна праводзяцца пасяджэнні.

— Падчас фарміравання праектаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню на чарговы фінансавы год прадугледжваюцца сродкі на знос, а каб у сельвыканкамах разумелі ўсе нюансы пры выкананні ўказа, праводзяцца семінары, — расказвае **старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў Ірына НОВІКАВА.**

На сесіях раённага і сельскіх Саветаў, пасяджэннях прэзідыума райсавета, сельвыканкамаў разглядаюцца пытанні па рэалізацыі ўказа. Штогод абследуюцца ўсе сельскія населеныя пункты, зацвярджаюцца адпаведныя спісы. На сходах грамадзян, падчас Дзён работы з насельніцтвам людзям расказваюць пра наступствы безгаспадарчага ўтрымання жылля...

> Дзеянне Указа № 100 накіравана на скарачэнне колькасці пустуючых і старых дамоў. А, значыць, у першую чаргу на прывядзенне ў парадак сельскіх сядзіб і зямельных участкаў, якія засталіся незапатрабаваныя. Прадугледжаны і знос не прыдатных да выкарыстання дамоў. Дакладнае выкананне палажэнняў указа патрабуе сур'ёзнай карпатлівай работы з уласнікамі па прывядзенні ў парадак пустуючых будынкаў, вызначэнні мэт далейшага выкарыстання дамоў, прызнаных рашэннямі суда нічыйнымі.

— Знос, дарэчы, ужываецца як крайняя мера. Яна датычыцца ў большай ступені старых, непрыдатных будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца па прызначэнні больш за тры гады, — працягвае Ірына Новікава.

За 2017 год у раёне знеслі 58 старых дамоў. У тым ліку за дзяржаўныя грошы (6,2 тысячы рублёў) — 17 старых дамоў з гаспадарчымі пабудовамі.

Як адзначыла Ірына Новікава, найбольш актыўна рэалізуецца ўказ на тэрыторыях Лаўжанскага, Мішневіцкага, Обальскага сельсаветаў.

ЗНОС старых дамоў адбываецца па рашэнні суда або сельвыканкама са згоды ўласніка (праваўладальніка).

— У прыватнасці, калі памерлі ўладальнікі, а сваякі не ўступілі ў правы спадчыны, і догляд за домам і зямельным участкам не ажыццяўляецца. Дзеянне Указа № 100 дазваляе законна прыняць меры па прывядзенні іх у парадак. Спадчыннікі маюць права прыняць рашэнне аб далейшым лёсе дома паводле прадпісання сельвыканкама. У выпадку непрыняцця мер з боку нашчадкаў, лёс дома і зямельнага ўчастка вырашае суд, — расказвае **старшыня Обальскага сельвыканкама Мікалай БУДНЕВІЧ.**

Быў выпадак, калі гаспадары памерлі, іх сыну і дачцэ дом, як яны пацвердзілі, не быў патрэбны. Рыхтаваліся дакументы на знос дома па рашэнні сельскага выканаўчага камітэта са згоды ўласніка (праваўладальніка). Але неўзабаве прыехаў трэці сын, які пажадаў выкарыстоўваць бацькоўскі дом. Сёння дом прыведзены ў парадак...

— Таму трэба дакладна ведаць, колькі сваякоў засталося пасля смерці ўласнікаў, каму з іх можа спатрэбіцца жыллё, — тлумачыць Мікалай Будневіч. — А яшчэ былі складанасці з пошукам расіян, якія ў свой час купілі дамы «з рук у рукі», і доўгі час не прыязджалі. Жыллё заставалася без нагляду, рамонту. Насамрэч праблема іх знайсці. Але атрымліваецца! У Санкт-Пецярбургу, напрыклад. Адпраўляем лісты, у якіх падрабязна ўсё тлумачым. Цярпліва чакаем адказы.

МІКАЛАЙ Будневіч падлічыў, што ў сярэднім на руйнаванне дома разам з гаспадарчымі пабудовамі з бюджэту трэба патраціць больш за 400 рублёў. Усяго падчас дзеяння ўказа на тэрыторыі сельсавета знеслі больш за 50 дамоў, у тым ліку летась — 10.

— Два дамы разабралі ратавальнікі. Будаўнічыя адходы ў адпаведнасці з патрабаваннямі экалагічнага заканадаўства падзялялі па відах: драўніну выкарысталі для кацельнай, рэшткі бітага шкла, металалому здалі ў якасці другаснай сыравіны. А дробненую цэглу, шыфер і г. д. адвезлі на палігон камунальных адходаў.

Зямельныя ўчасткі пасля зносу і рэкультывацыі выкарыстоўваюцца для будаўніцтва жылля, агародніцтва, вядзення асабістых падсобных гаспадарак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БУДНІ МАЛОГА ГОРАДА

Царква Святой Ефрасінні.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Яшчэ адна праблема — дарожнае пакрыццё. Апошні раз вуліца ў пасёлку асфальтавалася ў 2013 годзе. Але, паколькі мы пасялковы выканкам, артыкула расходаў на добраўпарадкаванне няма. У Івянцы ёсць участак раённага ўнітарнага прадпрыемства «Валожынская камунальная гаспадарка», — там і акумулююцца ўсе сродкі на гэтую справу, якія выдзяляюцца з раённага бюджэту.

Летась сутыкнуліся з адсутнасцю свабодных зямель для індывідуальнай жылёвай забудовы. Таму цяпер ідзе работа па змяненні генеральнага плана забудовы гарадскога пасёлка. Справа ў тым, што ў межы пассавета ўключаны землі, якія маюць сельскагаспадарчае прызначэнне, і вывесці іх з карыстання можна толькі са згоды кіраўніка дзяржавы... Таму і было прынятае рашэнне ўшчыльніць зону індывідуальнай забудовы, пасля чаго атрымалася дадаткова чатырнаццаць зямельных участкаў. Па другой зоне пытанне яшчэ ў стадыі вырашэння.

— У мінулым годзе мы прадалі два ўчасткі на аўкцыёне. Але сума за рэалізацыю аказалася невялікая — каля 7 тысяч рублёў. Каб разгарнуцца, недастаткова. Між тым у нас ужо ўзнікае праблема са шматкватэрнымі дамамі, якіх налічваецца каля трыццаці. Ім неабходны капітальны рамонт — дахаў, дымаходаў, бо гэтым будынкам каля 40 гадоў. А ў цэнтры ў пяціпавярховіку хацелася б правесці цеплавую рэабілітацыю або хоць бы прывесці яго ў больш эстэтычны выгляд, — кажа Тэрэса Ліпніцкая.

У Івянцы пражывае 5140 чалавек. Гэтая лічба апошнім часам трымаецца прыблізна на адным узроўні — невялікі плюс або мінус. У асноўным насельніцтва павялічваецца за кошт знешняй міграцыі. Апошнім часам усё больш мінчан купляюць тут дамы. Нядаўна з Мінска на вуліцу Кастрычніцкую пераехала сям'я з дзецьмі. Кажуць, што ў гарадку ціха, спакойна, размерана. У той жа час да сталіцы недалёка.

У Івянцы людзі жывуць дружна, паважаючы любое веравызнанне: і праваслаўныя, і католікі. Так склалася, што католікаў больш, каля 80 %. Многія сем'і змешаныя, адзначаюць і праваслаўныя, і каталіцкія святы. У пасёлку два касцёлы — Святога Міхаіла Архангела, які называюць у народзе Белы, і Святога Аляксея (Чырвоны), а таксама праваслаўная царква прападобнай Ефрасінні Полацкай. Сёлета настаяцель гэтага храма, протаіерэй Віктар Перагудаў быў узнагароджаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Айцец Віктар стварыў Дом міласэрнасці «Вікторыя» ў вёсцы Пральнікі, дзе клапоціцца аб дзецях-інвалідах Івянецкага дома-інтэрната. Па першай адукацыі ён мастак, і ўжо двойчы ў пасёлку арганізоўваў з Саюзам мастакоў міжнародны пленэр «Святасць зямлі беларускай».

...Калісьці ў Івянцы працавала больш за дзесяць розных прамысловых прадпрыемстваў. Не ўсім удалося выжыць, на некаторых значна пагоршылася сітуацыя. Напрыклад, на кандытарскай фабрыцы «Івкон» раней працавала 500 работнікаў, цяпер засталося каля 160. На ўвесь былы Савецкі Саюз калісьці грымеў «Івянецкі завод мастацкай керамікі», а сёння тут працуе 30 чалавек. Таму многія з мясцовых жыхароў ездзяць на работу ў Мінск і дзякуюць прыватнаму прадпрымальніку, які адкрыў адпаведныя рэйсы маршрутных аўтобусаў — у сталіцу можна дабрацца хутка і з камфортам.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА

ГУТАРКА, ВАРТАЯ АПАВЯШЧАЛЬНІКА

Пажылыя і адзінокія вяскоўцы па-ранейшаму з'яўляюцца групай рызыкі

ГАЛОЎНЫ спецыяліст інспекцыі нагляду і прафілактыкі Баранавіцкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр КАВАЛЬЧУК ужо добрае дзесяцігоддзе інспектуе Гарадзішчанскі сельсавет. Многіх насельнікаў вёсак ведае асабіста, асабліва тых грамадзян, якія складаюць так званую групу рызыкі. І першыя сярод іх — адзінокія састарэлыя людзі. Ім цяжэй за ўсё даглядаць хай сабе няхітрую хатнюю гаспадарку і падтрымліваць жыллё ў бяспечным стане.

Апошнім часам, пасля рэарганізацыі адміністрацыйных адзінак, у склад сельсавета ўвайшло 50 населеных пунктаў. Многія з іх даволі аддаленыя ад цэнтра, у некаторых засталося літаральна па некалькі жыхароў. Усіх даводзіцца наведваць, правяраць стан пажарнай бяспекі, гутарыць, пераконваць, а здараецца, прымаць неадкладныя меры рэагавання.

Жыхарка вёскі Несцяры Надзея Хвалько сустрэла Аляксандра Леанідавіча як свайго добрага знаёмага. Інспектар бываў у яе не раз. Менавіта па яго прапанове ў хаце бабулі ў мінулыя гады за кошт раённага бюджэту замянілі электраправодку, адрамантавалі дымаход. У прынцыпе жыллё зараз у бяспечным стане, апавяшчальнік спраўны, пры распальванні печы гаспадыня захоўвае правілы, канстатуе супрацоўнік МНС. Застаецца спадзявацца на тое, што пенсіянерка не забудзецца, напрыклад, своечасова закрыць печ, а таксама бабулю не падвядзе стан здароўя ў цэлым.

Яшчэ летась супрацоўнік МНС разам са старшынёй сельскага Савета заводзілі размову пра тое, што пажылой жанчыне нядрэнна было б перабрацца на зіму ў адпаведную ўстанову, напрыклад, у бальніцу сястрынскага догляду. "Скажам, выйшлі вы па дровы, паслізнуліся, упалі, — агучвалі службовыя асобы найгоршы з магчымых сцэнарыяў, — і каго чакаць: пакуль паштовы работнік прыйдзе, які раз у месяц прыносіць пенсію?" Жыхарка Несцяроў гаварыла ў адказ: маўляў, усе пад Богам ходзім, але ж чалавеку ўласціва спадзявацца на лепшае. А найлепей пажылому ўсё роўна ў сваёй хаце. Гэта значыць, што праз нейкі час Несцяры зноў стануць адрасам наведвання інспектара нагляду і прафілактыкі.

А вось Ніна Бортнік з хутара, які адносіўся да вёскі Кісялі, перабралася ў Вольнаўскую бальніцу сястрынскага догляду. У яе сітуацыя была зусім складаная. Бабулька пражывала на хутары, да якога дабрацца можна было толькі летам ды зімой, калі стаяць маразы. У дажджлівае надвор'е, разводдзе дарогу фактычна падтоплівала. Хата гаспадыні, даволі старая і недагледжаная, зусім не трымала цяпло. Печку бабуля паліла ўзімку цэлымі днямі, што супярэчыла пажарнай бяспецы, а старыя ватоўкі, якімі яна ўцяпляла дзверы, мала дапамагалі. Таму пераезд пенсіянеркі ў сацыяльную ўстанову з'явіўся адзіна правільным выйсцем.

Аляксандр Кавальчук адзначае, што многія пажылыя людзі вельмі добразычліва ставяцца да падобных праверак, дзякуюць, што да іх зайшлі і праведалі. Іншыя, энергічныя яшчэ пенсіянеры альбо бацькі шматдзетных сямействаў, могуць выказацца скептычна: маўляў, якая карысць з апавяшчальніка, ён жа пажар не патушыць, нават у службу "101" не патэлефануе. Тады інспектар доўга і падрабязна даводзіць грамадзянам, што ў XXI стагоддзі магчыма паставіць і такія прыборы. Напрыклад, абсталяваць дом пажарнай сігналізацыяй, тады сігнал пра ўзгаранне паступіць адразу на пульт МНС. Можна і аўтаномную сістэму пажаратушэння замовіць, калі цана пытання для домаўладальніка не з'яўляецца праблемай. А калі няма лішніх тысяч долараў, то не варта ігнараваць маленькі прыбор — апавяшчальнік, функцыяй якога заўсёды было разбудзіць чалавека, які спіць. І на рахунку менавіта гэтага немудрагелістага апарата ўжо дзясяткі выратаваных жыццяў у нашай краіне.

Паводле слоў Аляксандра Кавальчука, сёлетняе наведванне дамоў шматдзетных сем'яў парадавала. Фактычна ніякіх парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі не было выяўлена. Бацькі такіх сем'яў людзі адказныя, падтрымліваюць неабходны парадак. На сённяшні дзень ніводная з сем'яў, якія пражываюць на тэрыторыі сельсавета, не прызнаная сацыяльна-небяспечнай. Раней такія былі, успомніў Аляксандр Леанідавіч і адзначыў, што гэтая мера аказалася даволі дзейснай. Інспектар у складзе адпаведных камісій правяраў менавіта свае пытанні і назіраў, як выпраўляюцца праблемныя бацькі. Яны рабілі рамонты, раманталі печы і дымаходы, выконвалі прадпісанні сацыяльных і педагагічных работнікаў. І ў выніку былі знятыя з уліку. Такім чынам, дзеці засталіся ў сем'ях, да якіх апошнім часам не ўзнікае асаблівых пытанняў.

Старшыня Гарадзішчанскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр АНІКЕВІЧ адзначае, што па пытаннях супрацьпажарнай бяспекі яны працуюць у цеснай звязцы з супрацоўнікамі МНС, а таксама з трыма ўчастковымі. Міліцыянеры пры наведванні грамадзян таксама звяртаюць увагу на праводку ды печы.

— Паколькі ў склад сельсавета ўваходзіць 50 населеных пунктаў, дзе пражывае больш за пяць тысяч чалавек, а параметры тэрытарыяльнай адзінкі складаюць 32 на 18 кіламетраў, то не заўсёды выпадае наведваць домаўладанні цэлай камісіяй, — гаворыць старшыня сельвыканкама. — Каб даехаць да кожнага домаўладання, даводзіцца ажыццяўляць так званыя рэйды па адным. Ды затое, напрыклад, летась пабывалі ва ўсіх без выключэння 2300 домаўладаннях. Асаблівая ўвага ўдзяляецца адзінокім і тым, якія адзінока пражываюць, іх адпаведна 64 і 194. Скажам, у вёсцы Багушы жыве пенсіянер, які не лічыцца адзінокім. Але дзеці яго абсталяваліся ў Расіі, на малой радзіме бываюць рэдка. Сам пажылы чалавек не можа адрамантаваць печ. Таму сельвыканкам шукае магчымасці дапамагчы. Ужо дасягнутая домоўленасць з адной арганізацыяй, каб яе спецыялісты зрабілі ўказаную работу на ўмовах спонсарскай дапамогі.

> “Сёлетняе наведванне дамоў шматдзетных сем'яў парадавала. Фактычна ніякіх парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі не было выяўлена.

Яшчэ Аляксандр Мікалаевіч падзяліўся думкай наконт таго, якое вялікае значэнне маюць індывідуальныя гутаркі на тэму бяспекі. Здаецца, усе ведаюць, што курыць у пасцелі небяспечна. Ды, аказваецца, нагадваць курцам аб гэтым трэба, нібы малодшым школьнікам пра табліцу множання, штодня. Ужо сёлета прычынай пажару ў адным доме стала бяспечнасць гаспадара. Менавіта незатушаная своечасова цыгарэта каштавала жылля вясковаму жыхару. Закурыў і задрамаў. Прачнуўся ад таго, што гарыць пасцель. Паклікаў на дапамогу суседа, разам з ім затушылі ачаг. Так, прынамсі, яны палічылі. Але паколькі пакой быў задымлены, дыхалася цяжка, сусед запрасіў гаспадара пераначаваць у яго: маўляў, за ноч хата праветрыцца... Разбудзілі гаспадара ратавальнікі, якія тушылі яго дом. А каб папярэдзіць бяду, усяго толькі і трэба было не курыць у ложку...

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Баранавіцкі раён.

ТЭХНАЛОГІІ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ

МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ

Ці патрэбныя ў шматпавярховіках камеры відэаназірання?

АКТЫЎНА гаварыць аб тым, што сістэма відэаназірання неабходна ва ўсіх сталічных дамах, пачалі некалькі гадоў таму. Меркавалася, што выдаткі па ўстаноўцы возьмуць на сябе жыхары, а ўтрыманне будзе забяспечвацца са сродкаў гарадскога бюджэту. Аднак мяркуемых маштабаў праект не атрымаў. Таму жыхары шматпавярховак (акрамя элітнай забудовы) пытанне, патрэбна гэта «відэа» ці не, вырашаюць самі.

МУЛЯЖЫ НЕ ДАПАМОГУЦЬ

Часцей за ўсё асноўных прычын для ўстаноўкі відэакамер дзве: альбо дом толькі здадзены ў эксплуатацыю, альбо тут нядаўна зрабілі рамонт. Парадаксальна, але, калі гаворка заходзіць пра сістэму відэаназірання, у першую чаргу людзі задумваюцца не пра ўласную бяспеку, а пра маёмасць. Што ж, такую пазіцыю таксама можна зразумець: мала каму спадабаюцца нецэнзурныя надпісы на сценах, вечна раскіданыя па лесвічнай пляцоўцы бутэлькі і недакуркі ці пахі, якіх хочацца рашуча пазбягаць. Пытанне ў іншым: проста ўсталяваць камеры недастаткова — хтосьці павінен праглядаць відэазапісы. Наймаць для гэтага асобнага чалавека (што для кожнага жыхара выльецца ў кругленькую суму) уяўляецца абсурдным. Прымушаць рабіць гэта супрацоўнікаў ЖКГ — таксама, бо такія прагляды не ўваходзяць у іх абавязкі. А калі доступ да камер будзе ва ўсіх, гэта можа ператварыцца ў балаган, ды і занадта шмат сямейных таямніц стануць здабыткам грамадскасці. Застаецца адзін варыянт — чалавек, які займаецца кіраваннем домам у цэлым. У гэтым выпадку шмат што залежыць ад яго ініцыятыўнасці, зацікаўленасці і... паваротлівасці. Бо запісы з камер відэаназірання захоўваюцца не бясконца, звычайна гэты перыяд складае ад некалькі тыдняў да трох месяцаў.

Важным момантам з'яўляецца і заказ абсталявання — гэта якраз той выпадак, калі эканомія можа выйсці бокам. Самыя «хітрыя» ўсталёўваюць муляжы, але, па-першае, іх даволі цяжка прыняць за сапраўдную тэхніку. Па-другое, нават калі так адбудзецца, далёка не заўсёды наяўнасць камеры спыняе зламысніка. А «даказаць» яго віну ў далейшым пластыкавыя муляжы, на жаль, не здолеюць. Калі прынята разумнае рашэнне ўсталяваць сапраўдныя камеры, гнацца за павабнымі зніжкамі таксама наўрад ці варта — усё ж такі гэта ўкладанне на многія гады. На не дастаткова якасным абсталяванні бывае нават праблематычна вызначыць, мужчына ці жанчына на кадры, а не тое, што разгледзець рысы твару. А калі камеры ўстаноўлены на вуліцы, дык тым больш: вытрымаць зменлівыя ўмовы надвор'я здольныя далёка не ўсе цуды тэхнікі. Каб абсталяванне праслужыла доўга, камера павінна быць забяспечана казырком, мець герметычны корпус і сістэму падагрэву або сагравальны кажух — так-так, і такі бывае.

СЦЕНЫ МАЮЦЬ ВУШЫ І... ВОЧЫ

Дарэчы, нават калі вы ўпэўнены, што камеры патрэбныя, досыць складана зразумець, дзе менавіта іх замацоўваць. Каля ўваходу ў пад'езд? Зразумела. Каля ліфта? На першым паверсе — дакладна. А вось на астатніх паверхах? У двары? Адказ на апошняе пытанне — хутчэй за ўсё, так. У поле зроку камер можа трапляць дзіцячая пляцоўка, а лішні кантроль за дзецьмі ніколі не перашкодзіць. Акрамя таго, відэаназіранне дазволіць вырашыць нямала спрэчных пытанняў сярод аўтаўладальнікаў. (Нярэдка бывае, што суседзі ў вузкіх дварах драпаюць сваёй машынай іншую, не прызнаюцца ў гэтым, працягваюць міла ўсміхацца пры сустрэчы.) Таксама можна будзе заклікаць да адказнасці тых, хто паркуецца на зялёнай зоне або пакідае машыну ў двары, куды абмежаваны ўезд. Што датычыцца камер на паверхах, то тут шмат што залежыць ад арганізацыі прасторы ўнутры пад'езда. Калі няма агульнага балкона, а ўваход у тамбур зачыняецца на замок, то пры жаданні сэканоміць камеры можна і не ўсталёўваць, асабліва ў доме, дзе менш за 20 паверхаў, — інакш будзе цяжкавата прасачыць «чалавекапаток».

Калі доступ непасрэдна да запісаў ёсць не ва ўсіх, то назіраць у рэжыме анлайн з любой кропкі свету за тым, што адбываецца вакол дома, можа кожны ахвотны жыхар — дастаткова спампаваць спецыяльную праграму сабе на тэлефон ці камп'ютар. І ўжо не трэба кожны раз падбягаць да акна на гук машыннай сігналізацыі. Можна, не ўстаючы з канапы, паглядзець, што адбываецца, на экране тэлефона. Праўда, пытанне прыватнага жыцця застаецца адкрытае...

У цэлым, сістэма відэаназірання з прадмета раскошы паступова пераходзіць у разрад штодзённасці. Успомніце, яшчэ гадоў 20 таму нават дамафонная сістэма здавалася чымсьці дзіўным, а цяпер ёй аснашчаны практычна 100 % усіх дамоў у сталіцы. Як прадказваюць спецыялісты, тое ж будзе і з камерамі відэаназірання, толькі значна хутчэй. У многіх новых раёнах ужо нават не пытаюцца ў жыхароў, што яны наконт гэтага думаюць, — камеры ўваходзяць у спіс абавязковых опцый.

МЫ ВЕДАЕМ, ХТО ПАДРАПАЎ АЎТАМАБІЛЬ

Аднак, як вядома, не ўсё тое, што добра ў тэорыі, аказваецца такім жа на практыцы. Таму да выбару фірмы-падрадчыка варта падысці вельмі грунтоўна. Інакш вас чакаюць выкінутыя на вецер грошы — менавіта так ахарактарызавала ўстаноўку камер у сваім доме мінчанка Тамара.

Дому, які знаходзіцца ў нядрэнным раёне, менш за дзесяць гадоў. Мінулай вясной на ўваходзе ў пад'езды і на рагу дома ўсталявалі камеры. Паміж сабой жыхары пытанне не абмяркоўвалі — прадстаўнік арганізацыі, якая гэтым займаецца, прайшоў па пад'ездах і з усімі ахвотнымі заключыў дагавор. Абышлася навінка ў 80 рублёў з чалавека, праўда, сума аплаты была падзелена на пяць этапаў і ўключалася ў жыроўку. Цяпер за абслугоўванне кожны плаціць прыкладна 2,5 рубля ў месяц.

> Назіраць ў рэжыме анлайн з любой кропкі свету за тым, што адбываецца вакол дома, можа кожны ахвотны жыхар — дастаткова спампаваць спецыяльную праграму.

— Нядаўна быў інцыдэнт з падрапанай машынай. Калі папрасілі запісы з камер, то аказалася, што адна з іх наогул не працавала, бо арганізацыя не падтрымлівала яе ў нармальным стане. Хоць зрабіць гэта было нескладана — яе паправілі на наступны ж дзень. Акрамя таго, камеры ў пад'ездах глядзяць, груба кажучы, у падлогу: можна ўбачыць толькі маленькую пляцоўку перад уваходам — там, дзе лесвіца і лаўкі. Што датычыцца камеры на рагу дома, то яна не аглядае машыны, якія выязджаюць і прыязджаюць — бачная толькі малая частка паркоўкі. Карацей, у той справе з драпінай камеры не асабліва дапамаглі — на вынік паўплывалі відавочцы. Былі яшчэ інцыдэнты з аўтамабілямі, але фірма нават не дала запісы з камеры, бо ў пацярпелай не было дамовы з іх арганізацыяй, — расказвае Тамара.

А вось жыхары адной з новабудоўляў у Каменнай Горцы новаўвядзеннем засталіся вельмі задаволеныя. Падштурхнулі іх на такое рашэнне не самыя прыемныя здарэнні — кватэрныя крадзяжы. Пытанне аб камерах уздымалася і раней, але, як той казаў, пакуль смажаны певень не клюне... Як расказаў старшыня таварыства ўласнікаў, фірму, якая займаецца ўстаноўкай, выбіралі практычна паўгода. Абышліся 24 камеры на ўваходах у пад'езды і ліфты разам з устаноўкай па 50 рублёў з чалавека — далейшым абслугоўваннем таварыства вырашыла займацца самастойна. Некаторыя жартуюць, што ўкладанні ўжо акупіліся. За паўгода запісы з камер дапамаглі вызначыць, хто падрапаў аўтамабіль, у пяці выпадках. Ды і ў пад'ездзе стала чысцей: людзі саромеюцца смеціць.

Дарэчы, менавіта адсутнасць чысціні ў пад'ездзе стала адной з прычын усталяваць камеры для жыхароў дома ў Зялёным Лузе. Пасля гэтага свае пасады пакінулі некалькі майстроў па тэхнічным абслугоўванні. Праўда, як адзначаюць камунальныя службы, спосабаў кантролю якасці паслуг, акрамя камер, і так дастаткова. Але гэта добры стымул для саміх жыхароў паводзіць сябе больш свядома.

Дар'я КАСКО.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 25 студзеня 2018 года.